ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»

Пачалася падпіска на II квартал 2009 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы
63850 (індывідуальны)	10120	30360
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	9570	28710
63858 (ведамасны)	16170	48510
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	14740	44220

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

5 САКАВІКА 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 41
(26399)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

НЕАЦЭННЫ ЎНЁСАК

У краіне рыхтуюцца да святкавання 65-й гадавіны вызвалення

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на пасяджэнні Рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 65-й гадавіны вызвалення Беларусі, які ён узначальвае, зрабіў акцэнт на тым, як важна бачыць за сухімі лічбамі статыстыкі канкрэтных людзей: «Вельмі проста сказаць — подзвіг народа бессмяротны. І цяжэй ацаніць унёсак кожнага чалавека». Паводле агучанай ім інфармацыі, у нашай краіне сёння больш як 51 тыс. ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. І нават ва ўмовах фінансавага крызісу выдаткі на вырашэнне іх бытавых, медыцынскіх ды іншых важных пытанняў зніжацца не будуць — запэўніў прэм'ер. Размова ідзе і пра паляпшэнне матэрыяльна-бытавога становішча ветэранаў, і пра медпрэпараты, і пра санаторна-курортнае лячэнне... У краіне надаюць значную ўвагу забеспячэнню годнай пенсіі ветэранам — у сярэднім яе памер складае каля 576 тыс. рублёў. «Мы павінны працягнуць дзейнасць па ўвекавечанні памяці воінаў Чырвонай Арміі, партызанаў, падпольшчыкаў, мірных жыхароў нашай рэспублікі, якія аддалі свае жыцці за вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, за нашу Вялікую перамогу», — адзначыў кіраўнік Урада. Прэм'ер-міністр згадаў пра магчымасць разгледзець пытанне аказання сацыяльнай падтрымкі ветэранам не ў грашовай форме, а ўручэннем каштоўных падарункаў з сімволікай 65-й гадавіны вызвалення (напрыклад, тэлевізараў айчыннай вытворчасці). Ён дадаў, што падрыхтаваны праект Указа Прэзідэнта аб аказанні адначасовай матэрыяльнай дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і асобным катэгорыям грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, у сувязі са святкаваннем 65-й гадавіны вызвалення. А міністр абароны Леанід Мальцаў выказаў меркаванне, што эканамічна мэтазгодным будзе вырабіць юбілейныя медалі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў» для ветэранаў Беларусі на айчынных прадпрыемствах.

Зоя ВАРАНЦОВА.

На кантролі

Людзей турбуе рост цэнаў на жыллё

Амаль тры гадзіны доўжылася «прамая лінія» старшыні Камітэта дзяржкантролю Беларусі Зянона Ломаця з жыхарамі Мінска, падчас якой галоўны кантралёр краіны паспеў адказаць больш як на 30 зваротаў грамадзян. Аднак ахвотных падзяліцца сваім праблемамі з Зянонам Кузьмічом, пагутарыць пра набалелае было куды больш: дастаткова прыгадаць, што спробу дазвоніцца на «прамую лінію» было каля 1750.

Адразу зазначым, што ў асноўным звароты людзей тычыліся жыццёвых пытанняў. Адна з найбольш актуальных і набалелых праблем, што пацвердзіла і колькасць зваротаў, — рост цэнаў на жыллё. Прэтэнзіі ва ўсіх, нібы пісаныя пад капірку: у аднаго з моманту ўзвядзення дома ў жыллёва-будаўнічым кааператыве кошт квадратнага метра ў параўнанні з прапісаным у дагаворы паўгода таму за 1-2 месяцы ўзрос на 300 тысяч рублёў, у іншага — аж на 500 тысяч. А матывацыя такога імклівага росту кошту жылля ў большасці забудоўшчыкаў наступная: так адбываецца з-за павышэння зарплаты будаўнікам. Старшыня ж Камітэта дзяржкантролю катэгарычна не згодны з падобным падыходам і паабяцаў усім, хто датэлефанаваўся, прааналізаваць і разабрацца з тым, наколькі абгрунтаваны рост цэнаў. «Тут узнікаюць пытанні і вельмі сур'ёзныя, таму мы зоймемся аналізам сітуацыі, што звязана з будаўніцтвам жылля і павелічэннем расцэнак». На думку Зянона Ломаця, узнімаць зарплату будаўнікам толькі за кошт павышэння цаны жылля — не лепшае рашэнне. «Забудоўшчыкам неабходна паляпшаць якасць жылля, а павышэнне зарплаты павінна паходзіць са зніжэння затрат на будаўніцтва», — лічыць ён.

А мінчанка Людміла Віктараўна звярнулася да Зянона Ломаця з просьбай паспрыяць у вырашэнні яе праблем з вяртаннем валютнага крэдыту банку. Жанчына, між іншым, паведаміла падобную на некаторыя іншыя гісторыю, пра якія «Звязда» пісала ў адным з папярэдніх нумароў. Як высветлілася, яна пазычыла ў банка пэўную суму ў доларах, а вяртаць грошы цяпер стала цяжка — зарплата не вырасла, а курс валюты істотна дадаў у «вазе». Цяпер яна спадзяецца на тое, што на дзяржаўным узроўні прымуць нейкае рашэнне, якое дазволіць заяўніцы ўздыхнуць з палёгкай. «У такой сітуацыі апынуліся многія, хто пазычаў валюту ў банках», — заўважыў кіраўнік КДК. І дадаў, што ёсць дагаворныя абавязацельствы з банкам, якія неабходна выконваць: супакойваць у гэтай сітуацыі пазычальніцу няма чым — па даўгах трэба плаціць.

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды» па наяўнай праблеме ўхілення некаторых прадпрыемстваў ад падаткаў, Зянон Ломаць падкрэсліў, што практычна штодня ў краіне ўзбуджаюцца крымінальныя справы па такіх фактах. «Нягледзячы на тое, што дзейнічае ўказ Прэзідэнта аб прыпыненні праверачных мерапрыемстваў, мы працуем у рамках гэтага дакумента і праводзім праверкі кропкава, толькі на падставе аператыўнай інфармацыі аб парушэннях», — заўважыў ён. Сёння ў Беларусі, паводле слоў Зянона Ломаця, ёсць прыклады, калі суб'екты гаспадарання працуюць са стратамі, а іх кіраўнікі ездзяць на шыкоўных джыпах. Гэта значыць, яны проста падманваюць дзяржаву, ухіляючыся ад падаткаў. Між іншым, згодна з агучанай падчас «прамой лініі» інфармацыі, днямі была ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да дырэктара аднаго з камерцыйных прадпрыемстваў Віцебскай вобласці, які ўхіліўся ад выплаты падаткаў на суму больш як... 6 мільярдаў рублёў. Працягваючы тэму праверак суб'ектаў гаспадарання, старшыня КДК паведаміў, што сёлета іх колькасць за два месяцы ў параўнанні з адпаведным леташнім перыядам зменшылася напалову, што ніколькі не адбілася на выніковасці: напаўненне бюджэту за кошт хітруноў, якія ўхіляліся ад выплаты падаткаў, займаліся незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю, нават перавысіла паказчыкі студзеня-лютага мінулага года. Прычым цяпер у 99,9 працэнта праверак суб'ектаў гаспадарання, што праведзены, выяўлены парушэнні.

А вось пра парушэнні працоўнай дысцыпліны сярод дзяржслужачых, дакладней пра вынікі праверкі па спазненнях іх на працу, якую правёў Камітэт дзяржкантролю напрыканцы 2008 года, гаворка зайшла, калі Зянон Ломаць адказваў на пытанне ў ходзе «прамой лініі». Чыноўнікаў, якія «праштрафіліся», тады было больш за 170 чалавек. З усімі, хто спазніўся на працу без важкіх прычын, запэўніў старшыня Камітэта, разабраліся. І хоць ніхто з іх не быў звольнены — хто таго заслугоўваў, быў пакараны.

Падводзячы вынікі «прамой лініі», Зянон Ломаць, у прыватнасці, падкрэсліў: «Галоўная мая выснова — сёння, на жаль, адказныя работнікі, асабліва работнікі камунальных службаў, у многім недапрацоўваюць». Так, заўважыў ён, грамадзяне, якія па асобных пазіцыях звяртаюцца непасрэдна ў адміністрацыю раёна, часам не атрымліваюць адтуль нават адказаў. Старшыня Камітэта дзяржкантролю паабяцаў разабрацца з усімі такімі фактамі і даць ацэнку па іх, у першую чаргу, адказным асобам.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Жывая зямля

ВЯСНА ШАПОЧА...



Некалькі гадоў таму ў беларускіх лясах з'явіліся навасёлы — еўрапейскія лані. «Звязда» ўжо расказвала пра завезеных з Літвы хутканогіх прадстаўнікоў сямейства аленевых у Лепельскі лясгас, узгадвала паляўнічую гаспадарку ў Астравецкім раёне. У сакавіку спаўняецца роўна год, як амаль 80 статных госцяў з'явіліся і ў галоўным нацыянальным парку краіны — Белавежскай пушчы, якія былі завезены з суседняй Польшчы. У пушчы іх называюць даніэлямі, хоць на латыні назва жывёл пішацца зусім інакш: «Zerus dama». З нагоды 600-годдзя запаведнасці Белавежскай пушчы было прынята рашэнне аднавіць гэтую папуляцыю, колькасць якой, па навуковых звестках, у 1914 годзе складала паўтары тысячы асобін. У кожнага, каму ўжо даводзілася бачыць пушчанскіх даніэляў, здзіўленне найперш выклікае разнастайная афарбоўка жывёл — ад бела-жоўтага да чорнага колеру. У самцоў характэрныя і вельмі прыгожыя рогі, за якія, верагодней за ўсё і былі вынішчаны даніэлі. У адрозненне ад звычайных аленяў, зуброў і дзікоў пушчанскія навасёлы праяўляюць сапраўдную пяшчоту адно да аднаго, як бачна на гэтым фотаздымку. Так што пяшчоты і дабрыні ў нас толькі паболела.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Лепшых жанчын прымусілі хвалявацца, як дзяўчатак перад першым спатканнем

Напярэдадні 8 Сакавіка падведзены вынікі Першага рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года».

Яны вельмі розныя. Гэта і шматдзетныя маці, і кіраўнікі буйных прадпрыемстваў, і лідары грамадскіх аб'яднанняў, і прафесіяналы сваёй справы, і нават — манахіня. Самай старэйшай з іх 75 гадоў, самай малодшай — 33. Сярод удзельніц былі і маладзейшыя, кажуць арганізатары конкурсу, але адна з важных умоў заваявання тытулу «Жанчына года» — жыццёвы вопыт. Ён не абавязкова павінен быць працяглым па часе, але галоўнае — узорным для іншых.

— Усе жанчыны, якія сталі намінантамі, — гэта сапраўды гонар нацыі, — сказала падчас цырымоніі ўзнагароджвання **Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў і член журы конкурсу.** — З іх будуць рабіць сваё жыццё нашы дочкі і ўнучкі. Дай Бог, каб гэты конкурс квітнеў і даваў прыклад беларускам. Каб менавіта з гэтых выдатных жанчын і адраджалася наша нацыя. Па сутнасці гэта і ёсць наша нацыянальная ідэя.

Конкурс праводзіў Беларускі саюз жанчын сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай пры падтрымцы міністэрстваў інфармацыі, працы і сацыяльнай абароны. Работа была праведзена вялізная. Нездарма на пачатку цырымоніі ўзнагароджвання **памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Усевалад ЯНЧЭЎСКІ** ўручыў Ганаровую грамату Адміністрацыі Прэзідэнта чалавеку, які быў галоўным натхняльнікам гэтай ідэі і які сам з'яўляецца ўнікальнай жанчынай і асобай — **Надзеі ЕРМАКОВАЙ, старшыні Беларускага саюза жанчын, старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк».**

На працягу мінулага года ў раёнах, гарадах і абласцях нашай краіны (у большасці выпадкаў па ініцыятыве першасных арганізацый Беларускага саюза жанчын) абмяркоўваліся і вылучаліся кандыдаты на званне лепшай жанчыны года. Журы, у склад якога ўвайшлі члены Савета Рэспублікі, дэпутаты, прадстаўнікі рэспубліканскіх органаў кіравання, дзеячы культуры і мастацтва, прадпрымальнікі і журналісты, разгледзела 50 выдатных жаночых лёсаў. Выбраць з іх толькі пяць было задачай занадта складанай, і колькасць намінацый пашырылі ўдвая.

Фота БЕЛТА.

Пераможцай у намінацыі ***«За лідарства і паспяховае кіраўніцтва»*** стала **Тамара ФІЛІПОВІЧ, дырэктар Ашмянскага мясакамбіната.** Яна ўзначаліла прадпрыемства ва ўзросце 33 гадоў і здолела з разраду радавога перайтварыць яго ў высокатэхналагічнае. Вельмі важным крытэрыем у гэтай намінацыі было стварэнне на вытворчасці добрых умоў працы і быту для жанчын.

У намінацыі ***«За актыўную грамадскую дзейнасць»*** лепшай названа **Рэгіна КАРПЕЗА, прыёмная маці аддзела адукацыі Гомельскага райвыканкама, старшыня Асацыяцыі прыёмных бацькоў, выдатнік народнай адукацыі.**

У намінацыі ***«За развіццё жаночага руху»*** перамагла **Ларыса ЧАРАПАНАВА, рэктар жаночага інстытута «ЭНВІЛА», лаўрэат прэміі мітрапаліта Філарэта «Хрысціянскія традыцыі ў культуры і адукацыі».**

Жанчынай года ў намінацыі ***«За дабрачыннасць і міласэрнасць»*** названа **Наталля ІЛЬНІЦКАЯ, генеральны дырэктар ТАА «Лагуна»** (Брэст).

«За высокі прафесіяналізм» узнагароджана **Ганна ШАРЭЙКА, дырэктар Віцебскай бройлернай птушкафабрыкі, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, кандыдат сельскагаспадарчых навук** *(на здымку).*

«За дасягненні ў выхаванні дзяцей» жанчынай года стала **Жанна КАВАЛЬСКАЯ, выхавальніца Дзіцячага дома сямейнага тыпу Мядзельскага раённага аддзела адукацыі.** У яе доме растуць двое ўласных і 11 прыёмных дзяцей, а яшчэ кожнае лета гасцююць выхаванцы Жодзінскай школы-інтэрната.

Асаблівай стала намінацыя ***«За жаночую мужнасць».*** Тут была адзначана жанчына, сын якой загінуў у Афганістане і якая прысвяціла сваё жыццё падтрымцы тых, хто пакінуў падобнае гора. **Людміла АДАМАВА ўзначальвае Рэспубліканскую Асацыяцыю членаў сем'яў вайскоўцаў, якія загінулі ў Афганістане, «Памяць і абавязак».**

Журы прызнаецца, што выбраць лепшую з намінантак ***«За вернасць і адданасць прафесіі»*** было асабліва складана. Аднак ёю, напэўна, правамерна стала **Ніна ПЯТРОВА, генеральны дырэктар ТАА «Стужка»,** чалавек-легенда, ганаровы грамадзянін горада Магілёва. За 49 гадоў працы на прадпрыемстве яна прайшла шлях ад ткачыхі да кіраўніка.

«За дасягненні ў сельскагаспадарчай вытворчасці» ўзнагароджана **Таццяна КУДЗЁЛКА, старшыня СВК «Старобінскі» Салігорскага раёна.** Яе прадпрыемства з'яўляецца бясспрэчным лідарам раёна апошнія 5 гадоў.

У намінацыі ***«За ўнёсак у духоўна-маральнае адраджэнне грамадства»*** прыз быў уручаны **ігуменні Гаўрыіле, настаяльніцы Гродзенскага Свята-Ражства-Багародзічнага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра.**

— Гэты конкурс — таксама рэальны ўнёсак у духоўнае адраджэнне нашага грамадства, — заўважыла **Лілія АНАНІЧ, першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь.** — Усе яго прадстаўнікі — краса беларускіх жанчын, а значыць, — краса беларускай дзяржавы.

Яны вельмі розныя. Аднак усіх іх аб'ядноўвае нешта агульнае — клопат пра іншых, перамога над абставінамі, неабыякавасць і воля.

— Узнагарода гэта не мая, гэта прызнанне ўсіх тых, хто імкнецца рабіць добра, хто не праходзіць міма тых, каму патрабуецца дапамога альбо проста добрае слова, — сказала ігумення Гаўрыіла пасля таго, як спусцілася са сцэны. — Наш жаночы абавязак — несці мір і спакой у сваім сэрцы, захоўваць сямейны ачаг, стваральны свет утульным і добрым, быць ласкавай і клапатлівай.

Падвядзенне вынікаў конкурсу стала сапраўдным святам, цёплым і пяшчотным. Некаторыя плакалі, але слёзы гэтыя былі светлыя, якія прыносяць палёгку сэрцу. Гэта няпроста — быць жанчынай. Яшчэ больш няпроста — быць лепшай жанчынай. Яны дзякавалі за тое, што іх прымусілі хвалявацца, як дзяўчатак перад першым спатканнем. Атрымалася сапраўднае свята жаночай прыгажосці ва ўсіх яе іпастасях. Той самай прыгажосці, якая прызначана выратаваць гэты свет.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Народжаныя восенню і зімой часцей сутыкаюцца з псіхалагічнымі праблемамі

Да такой высновы прыйшлі спецыялісты Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей.

— Магчыма, у перыяд унутрывантробнага развіцця і першых месяцаў жыцця яны адчувалі дэфіцыт вітамінаў, сонца, таму псіхалагічных праблем у іх больш, — лічыць дырэктар цэнтра Андрэй Туравец. — Што да «вясновых» і «летніх» людзей, то істотнай розніцы ў іх псіхалагічных партрэтах не выяўлена. Яны ў роўнай меры валодаюць лідарскімі якасцямі і, акрамя таго, у крызісныя этапы жыцця часцей імкнуцца змяніць сябе, тады як народжаныя зімой нярэдка стараюцца перарабіць «пад сябе» партнёра, а таксама ўласных дзяцей і бацькоў.

«Вясновыя» людзі часам схільныя ў неспрыяльных сітуацыях адчайвацца, расказаў псіхолог. Затое калі ўжо змогуць пераадолець цяжкасці, то ў сваім развіцці дасягаюць высокага ўзроўню.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.03.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 870,00
▼ 1 еўра	3 597,83
1 латвійскі лат	5 080,55
1 літоўскі літ	1 040,80
1 чэшская крона	128,97
1 польскі злоты	757,22
▲ 1 расійскі рубель	79,22
1 украінская грыўня	365,61

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	36,2284
10 UAH	46,1508
1000 BYR	12,6628
EUR	45,3543

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БЫЛЫ ПРЭМ'ЕР АБВІНАВАЦІЎ СААКАШВІЛІ Ў КРАДЗЯЖЫ МІЛЬЯРДАЎ ДОЛАРАЎ

Былы прэм'ер-міністр Грузіі Зураб Нагаідэлі 4 сакавіка абвінаваціў прэзідэнта краіны Міхаіла Саакашвілі ў крадзяжы.

«Выдаткаваныя на закуп узбраення два мільярды і некалькі сот мільёнаў долараў сапраўды былі прысвоеныя Саакашвілі і яго атачэннем», — цытуе выданне Грузія Online Нагаідэлі, які перайшоў у апазіцыю. Ён таксама абвінаваціў Саакашвілі ў дзяржаўнай здрадзе, растлумачыўшы, што зброя, якая нібы закуплялася на гэтыя грошы, насамрэч не існавала, а тая, што была, аказалася няспраўнай.

СБУ ШУКАЛА Ў ОФІСЕ «НАФТАГАЗА» «СКРАДЗЕНЫ» ТРАНЗІТНЫ ГАЗ

Учора днём група ўзброеных людзей у масках уварвалася ў будынак НАК «Нафтагаз Украіны» ў Кіеве. Як пазней высветлілася, «захопнікамі» былі супрацоўнікі Службы бяспекі Украіны.

У «Нафтагазе» заявілі, што супрацоўнікі СБУ спрабавалі канфіскаваць арыгіналы дамоў з «Газпрамам» на транзіт і пастаўку прыроднага газу на 2009—2019 гады.

У СБУ заявілі, што яны дзейнічаюць правамерна і праводзяць адабранне дакументаў у рамках крымінальнай справы аб завалоданні НАК «Нафтагаз Украіны» 6,3 мільярда кубаметраў газу на суму звыш 7,4 млрд грыўняў. У намесніка галоўнага бухгалтара кампаніі здарыўся сардэчны прыступ.

МІЖНАРОДНЫ СУД УПЕРШЫНЮ Ў ГІСТОРЫІ САНКЦЫЯНАВАЎ АРЫШТ ПРЭЗІДЭНТА

Міжнародны крымінальны суд (МКС) прыняў бесprэцэдэнтнае рашэнне і выдаў ордэр на арышт прэзідэнта Судана Амара Хасана Ахмеда аль-Башыра. Кіраўнік дзяржавы сваю віну не прызнае і нават жадае суддзям гэты самы ордэр з'есці.

Аль-Башыру было прад'яўлена абвінавачванне па сямі пунктах: у тым ліку па пяці — злачынствах супраць чалавечнасці і па двух — у ваенных злачынствах. Гэта першы выпадак, калі МКС выдае ордэр на арышт дзейснага кіраўніка дзяржавы. Тым не менш, Судан не збіраецца выдаваць свайго прэзідэнта міжнароднаму правасуддзю. А сам аль-Башыр, як піша The Daily Telegraph, проста ігнаруе ордэр, папярэдзваючы, што дакумент не будзе каштаваць нават чарнілаў, якімі напісаны.

Нагадаем, што прад'яўленыя аль-Башыру абвінавачванні адносяцца да канфлікту ў суданскім рэгіёне Дарфур, які абвастрыўся ў 2003 годзе. Паводле ацэнкі ААН, падчас яго каля 2,5 млн чалавек засталіся без прытулку, а колькасць загінулых дасягае 300 тысяч.

НАЗВАНАЯ ПРЫЧЫНА КРУШЭННЯ ТУРЭЦКАГА «БОІНГА» Ў НІДЭРЛАНДАХ

Камісія па расследаванні акалічнасцяў крушэння самалёта Boeing 737-800 авіякампаніі Turkish Airlines у Нідэрландах назвала прычыну катастрофы.

Следчы савет па пытаннях бяспекі прыйшоў да высновы, што самалёт рэзка страціў хуткасць перад пасадкай і зваліўся за некалькі кіламетраў ад узлётна-пасадкавай паласы з-за няспраўнага прыбора, які вымярае вышыню, — альтыметра. Высветлілася, што падчас катастрофы лайнер ішоў на пасадку на аўтапілоце. Нагадаем, ахвярамі авіякатастрофы сталі 10 са 135 чалавек, якія знаходзіліся на борце.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

БЫЛЫ ГЕНДЫРЭКТАР КЛІМАВІЦКАГА ЛІКЁРА-ГАРЭЛАЧНАГА ЗАВОДА ВЫКРАЎ У ПРАДПРЫЕМСТВА БОЛЬШ ЯК BR548 МЛН

Пра гэта паведамілі ў пракуратуры горада Мінска.

Абвінавачаны прадоўжыў злачынныя дзеянні, з'яўляючыся выканаўцам абавязкаў генеральнага дырэктара ППУП «Харчовы камбінат Белкаапсаюза». Ён завалодаў маёмасцю камбіната больш як на Br128 млн. Асуджаны да 10 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Уладзімір МАЦВЕЕЎ, БЕЛТА.

СІНОПТЫКІ 8 САКАВІКА АБЯЦАЮЦЬ СНЕГ

Такі прагноз на першае вясенняе свята агучыў на прэс-канферэнцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў рэспубліканскага Гідраметэацэнтра Дзмітрый Рабаў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

У першай дэкадзе сакавіка начныя тэмпературы складуць ад 4 да 2 градусаў марозу, дзённыя — ад мінус 1 да плюс 4 градусаў. Другая дэкада месяца будзе крыху цяплейшая: ноччу — ад 5 градусаў марозу да 2 градусаў цяпла, а дзённыя тэмпературы будуць вагацца ад мінус 1 да плюс 8 градусаў. Па-сапраўднаму вясенняе надвор'е будзе толькі ў трэцяй дэкадзе сакавіка, калі чакаецца ад 1 да 8 градусаў цяпла, а на поўдні паветра будзе прагравацца да 14 градусаў вышэй за нуль.

ЛЬГОТНЫЯ КРЭДЫТЫ Ў МІНСКУ ПРАДАСТАЎЛЯЮЦЦА НА ДОЛЕВАЕ БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ Ў ДАМАХ, УКЛЮЧАНЫХ У ГРАФІКІ ФІНАНСАВАННЯ НА 2009 ГОД

Аб гэтым паведаміла начальнік аддзела прававога забеспячэння ўпраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Алена Лукашэвіч на прэс-канферэнцыі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

АМЕРЫКАНСКІ СУРОК НЕ КАНКУРЭНТ БАБРУЙСКАМУ БАБРУ

З ініцыятывай правядзення такога свята выступіла бабруйчанка Наталля Цымбурская. Яна накіравала ў органы ўлады і розныя арганізацыі каля паўсотні лістоў з просьбай падтрымаць слушную ідэю.

Наталля Цымбурская прапануе правесці першы Дзень бабра 21 сакавіка, бо гэта пачатак года Чырвонага бабра па авесційскім календары. У гэты дзень, на думку актывісткі, было б варта наведаць бабровую хатку на рацэ Бярэзіне і паназіраць за жывёламі, а потым часта вацца булачкамі з «бабровай» назвай у адной з мясцовых кавярняў. У праграме свята таксама будуць выстава пра баброў і конкурс на «лепшага бабра».

Наталля лічыць, што бабёр як сімвал Бабруйска можа стаць сапраўдным брэндам на рынку турыстычных паслуг. А Дзень бабра ў будучыні, калі ўдасца сумеснымі сіламі раскруціць ідэю, мог бы паспяхова канкураваць з народным амерыканскім Днём сурка.

— У нашым горадзе больш за 70 сем'яў, якія маюць «бабровыя» прозвішчы, — расказвае жанчына. — Трэба больш сувенірнай прадукцыі з выявай бабра, няхай бы з'явіліся і падобныя ласункі. Можна запрасіць гасцей з «бабровых» населеных пунктаў. У Мінскай вобласці ёсць горад Бобр, на Брэстчыне — вёска Бабровічы, у Воронежскай вобласці — горад Баброў. Дзень бабра — гэта не першая ініцыятыва актыўнай бабруйчанкі. Ідэя Наталлі Цымбурскай аб правядзенні фестывалю бульбы спадабалася бабруйчанам, і ўвосень у горадзе арганізуюцца мерапрыемствы, прысвечаныя бульбе як вельмі важнаму харчу ў жыцці беларусаў.

Ілона ІВАНОВА.

«КАЗЮКІ-2009»

Фота Леаніда ШЧАГЛОВА, БЕЛТА.

Традыцыйная выстава-кірмаш «Казюкі-2009» прайшла 4 сакавіка ў Гродне. Свята, на якое былі запрошаны больш як 120 майстроў з усіх абласцей рэспублікі, праходзіла ўжо восьмы раз. Гэтае свята праводзіцца з мэтай адраджэння даўняй традыцыі першых веснавых кірмашоў, якія на Гродзеншчыне і Віленшчыне арганізоўвалі з канца XVII стагоддзя. З 1690 года гэтыя кірмашы сталі называцца «Казюкі», бо праводзіліся 4 сакавіка, у дзень святога Казіміра, які з'яўляецца заступнікам майстроў і рамеснікаў.

НА ЗДЫМКУ: бондарскіх спраў майстар ***Міхаіл КУКСА.***

ВЫРАТАВАЛЬНІКІ ЗНЯЛІ З КРЫГІ НАВУЧЭНЦА ПТВ

Сталічныя выратавальнікі знялі з крыгі на рацэ Свіслач навучэнца першага курса Мінскага гарадскога прафтэхвучылішча № 9. Аб гэтым паведаміў прэс-сакратар Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Аляксандр Лапанік.

Здарэнне адбылося насупраць будынка па вул. Чырвонаармейскай, 37. Малады чалавек знаходзіўся на крызе пасярод ракі. Аднаму з выратавальнікаў давялося залезці ў ваду ў гідракасцюме і ўручную прычаліць крыгу да берага.

Уладзімір МАЦВЕЕЎ, БЕЛТА.

ПІТБУЛЬТЭР'ЕР ЛЕДЗЬ НЕ ЗАГРЫЗ ГАСПАДАРОЎ

Пра здарэнне расказаў уладальнік сабакі, жыхар пасёлка Руба Віцебскага раёна.

Прычынай агрэсіі жывёлы паслужыла павышэнне на яе голасу гаспадыні, якая стала першай ахвярай сабакі. Затым гадаванец накінуўся на мужчыну, які пачаў абараняць жонку. Жанчына паспела ў гэты час выбегчы з кватэры і зачыніць за сабой дзверы, а гаспадар уцёк у іншы пакой. Каб аказаць дапамогу, давялося выклікаць супрацоўнікаў МНС, якія пры дапамозе спецыяльнай выратавальнай амуніцыі эвакуявалі пацярпелага праз акно другога паверха. Дабрацца да яго іншым спосабам было немагчыма, адважных увайсці ў кватэру з раз'юшаным сабакам байцоўскай пароды не знайшлося. Агрэсіўнага сабаку давялося забіць.

Вольга БАГАЧОВА, БЕЛТА.

ПАДАЗРАЕЦЦА ТРЭНЕР ЗБОРНАЙ

Галоўны трэнер Нацыянальнай зборнай Беларусі па воднаслыжным спорце Віктар Наважылай падазраецца ў буйным крадзяжы. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў пракуратуры Першамайскага раёна Мінска.

Пракуратура Першамайскага раёна ўзбудзіла крымінальную справу, у матэрыялах якой фігуруе сума каля Br25 млн. Злачынныя дзеянні, у якіх падазраецца Віктар Наважылай, адносяцца да перыяду, калі ён узначальваў Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па воднаслыжным спорце.

ВЫБАР — ЗА ЖЫХАРАМІ?

Жыллё маё

Налета будуць праводзіцца тэндары на абслугоўванне дамоў

У 1990-м на долю прыватнага жылфонду ў Беларусі прыпадала толькі крыху больш за палову агульнай плошчы — 54 працэнты. Літаральна праз два гады, калі быў прыняты адпаведны закон, пачалася актыўная прыватызацыя жылля. І сітуацыя літаральна на вачах змянілася: як паводамілі ў Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі, цяпер прыватны жылфонд складае 85 працэнтаў. Невялікую долю (2 працэнты) займаюць ведамасныя жылыя памяшканні, а астатняе — дамы і кватэры, што знаходзяцца ў камунальнай уласнасці. Інакш кажучы, жыллё, якое па розных прычынах жыхары не прыватызавалі. Паколькі большасць жылфонду цяпер знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, то паўстае надзённае пытанне наконт змянення формы яго кіравання. Укараняюцца схемы, апрабаваныя ў сусветнай практыцы, якія, на жаль, пакуль не прынеслі чаканага эфекту.

Сярэдняя кватплата — 500 еўра

Найперш за ўсё ў нас актыўна ствараюцца таварыствы ўласнікаў жылля. Айчынны закон аб сумесным домаўладанні быў прыняты даволі даўно, аднак шмат у чым застаўся на паперы. Да прыкладу, у Германіі адпаведная заканадаўчая база была сфарміравана больш чым паўстагоддзя таму. Асноўны момант: калі чалавек набывае кватэру, то ён аўтаматычна становіцца ўдзельнікам аб'яднання ўласнікаў жылля. Гэтая арганізацыя не з'яўляецца кіраўніцкай кампаніяй, яна толькі заключае дагавор з адпаведнай прафесійнай структурай. А далей, як кажуць, «справа тэхнікі».

Існуюць даволі моцныя «канторы», якія займаюцца менавіта арганізацыяй абслугоўвання жылля. Так, у сярэдняй такой кампаніі, дзе штат складаецца з 45 супрацоўнікаў, гадавы абарот дасягае 3,5 мільёна еўра. Гэта прыбытковая і «грашовая» справа, таму на рынак імкнуцца патрапіць многія. Арганізацыі вельмі апасаюцца страціць дзелавую рэпутацыю, таму не дапускаюць нейкіх там «хібаў» у абслугоўванні. Інакш можна адразу і назаўсёды згубіць сваё месца, а жыхары без цяжкасцяў знойдуць іншую кампанію, якая здолее ўсё арганізаваць належным чынам. Тарыфная палітыка «вярстаецца» такім чынам, каб поўнасцю вярнуць не толькі затраты, але і будучыя інвестыцыі на развіццё. У выніку квартплата «набягае» значная — за кватэру агульнай плошчай 70 «квадратаў» неабходна выкласці каля 500 еўра. Гэта ў сярэднім, паколькі плацяжы адрозніваюцца ў залежнасці ад размяшчэння і аснашчанасці жылля. Так, у Берліне квартплата даходзіць да 11 еўра за 1 кв. метр, а ў асобных раёнах нямецкай сталіцы можна знайсці кватэры, дзе патрабуецца 2-3 еўра за «квадрат».

З 700 таварыстваў «праваліліся» толькі 2

На абслугоўванні прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў нашай дзяржаве знаходзяцца 57 тысяч жылых дамоў, з іх 50 тыс. — шматкватэрныя. Такім чынам, за ЖЭСамі па-ранейшаму «замацавана» значная частка айчыннага жылфонду — па розных ацэнках дзесьці 88 працэнтаў.

— У такім разе манапалізм сапраўды прысутнічае, — прызнае **начальнік аддзела эксплуатацыі жыллёвага фонду, арганізацыі і правядзення жыллёвай рэформы ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Міхаіл КОЛАСАЎ.** — І гэта ў пэўным сэнсе негатыўны факт, паколькі няма канкурэнцыі, важкага стымулу павышаць якасць і змяншаць выдаткі — гэта задачы, якія мы ставім перад падведамаснымі арганізацыямі, і якія яны, прызнаемся, у асобных выпадках не надта эфектыўна вырашаюць. Існуе шэраг праблем па эксплуатацыі, утрыманню жылля. Канцэпцыяй развіцця жыллёва-камунальнай галіны прадугледжваецца дэманапалізацыя спосабу кіравання жыллём, што павінна прынесці станоўчы вынік.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Беларусі да 2000 года ўвогуле не было паўсюднага прыборнага ўліку спажывання камунальных паслуг (за выключэннем хіба што электрычнасці). Цяпер дакладна ўлічваюцца аб'ёмы выкарыстання цяпла і вады. Апошнім часам завершаны абсталяванне дамоў, лічыльнікі ўсталёўваюцца ў кватэрах. Калі адпаведныя прыборы ўліку цяпла можна ўсталяваць не ўсюды, то па вадамерах праблем няма. У выніку масавага ўсталявання жыхарамі вадамераў (дарэчы, цяпер імі абсталявана 95 працэнтаў жылфонду) на працягу апошніх двух гадоў удалося зменшыць спажыванне вады на 140 мільёнаў кубаметраў.

Як спадзяюцца ў Мінжылкамунгасе, змяншаць выдаткі на абслугоўванне жылля ўдасца праз прыцягненне да кіравання жылфондам уласнікаў жылля. У адпаведнасці з заканадаўствам, якое дзейнічае цяпер, таварыствы абавязкова павінны стварацца ў новабудоўлях. Атрымліваецца, што асноўная колькасць аб'яднанняў уласнікаў жылля створана менавіта ў такіх дамах. Як паведаміў Міхаіл Коласаў, усяго дзейнічае каля 700 таварыстваў. Амаль палова з іх працуюць у сталіцы. За ўвесь час было ліквідавана 2 таварыствы ўласнікаў. На думку спецыяліста Мінжылкамунгаса, так атрымалася з-за таго, што мясцовыя ўлады належным чынам не дапамаглі аб'яднанням жыхароў у складаней сітуацыі.

Палова жыллёва-будаўнічых кааператываў і 70 працэнтаў таварыстваў знаходзяцца на самаабслугоўванні (самі наймаюць штат патрэбных спецыялістаў і вырашаюць гаспадарчыя праблемы па забеспячэнні падачы камунальных паслуг і тэхнічнага абслугоўвання жылля). Астатняя колькасць гэтых арганізацый аддаюць перавагу ЖЭСам. На долю недзяржаўных арганізацый, якія займаюцца абслугоўваннем жылфонду, прыпадае менш чым 1 % усёй прапановы.

Такую сітуацыю неабходна тэрмінова выпраўляць, таму, мяркуюць у Мінжылкамунгасе, з наступнага года паэтапна будзе ўкараняцца абслугоўванне жылля на конкурснай аснове. Плануецца праводзіць спецыяльныя тэндары, праўда, спачатку на вялікіх дамах. Хто вылучыць больш прывабную прапанову — той і будзе займацца абслугоўваннем жылля.

У такім разе ў жыхароў з'явіцца права выбару. Толькі вось ці ўдасца яго рэалізаваць ва ўмовах манапалізму тых жа ЖЭСаў?

Як зменшыць плацяжы?

Дзяржава мае намер усяляк падтрымліваць аб'яднанні ўласнікаў жылля (таварыствы, ЖБК і інш.). Паводле слоў Міхаіла Коласава, адпаведныя змяненні будуць улічаны ў новым Жыллёвым кодэксе, які мяркуецца прыняць налета. Але інтарэс прыватнікаў да абслугоўвання жылля пэўным чынам стрымлівае тарыфная палітыка. Як вядома, жыхары цяпер вяртаюць толькі каля 30 % сабекошту камунальных паслуг. Астатняе пакрываецца за кошт дзяржаўных датацый, арэнднай платы, уласных сродкаў прадпрыемстваў. Зразумела, па такой схеме прадпрымальнікам працаваць цяжка. Як заўважыў Міхаіл Коласаў, у перспектыве тарыфы будуць павялічвацца. Спярша планавалася, што ўжо праз два гады насельніцтва будзе вяртаць не менш чым 60 % затрат — у такім разе кватэрныя плацяжы павысіліся б удвая. Аднак, заўважаюць у Мінжылкамунгасе, гэтыя планы абавязкова будуць скарэктаваны з улікам канкрэтнай сітуацыі і ўзроўню даходаў жыхароў.

У найбліжэйшай перспектыве мяркуецца перайсці на падамавы ўлік затрат па тэхнічным абслугоўванні. Магчыма, што гэтая мера дазволіць пэўным чынам зменшыць плацяжы. Дарэчы, тут ёсць адпаведныя прыклады. Так, у сталічным таварыстве ўласнікаў жылля «Ачаг» плацяжы жыхароў на 10-15 % меншыя, чым у суседніх дамах. Як заўважыў **старшыня гэтага таварыства Генадзь КАЛЕНАЎ,** варта толькі правільна арганізаваць работу і адразу будзе вынік. Цяпер на абслугоўванні ў «Ачага» больш чым 150 кватэр — жылфонд, да якога можна і трэба паставіцца адрасна, з неабходнай увагай. Пакуль што не ўдалося дасягнуць еўрапейскага ўзроўню спажывання энергарэсурсаў, аднак, лічыць Генадзь Каленаў, гэта справа часу. У цэнтры ўсіх дзеянняў заўсёды павінен быць не канкрэтны кіраўнік таварыства, а супольнасць уласнікаў кватэр. Толькі ў такім выпадку намечаны план удасца рэалізаваць у поўнай меры.

Але існуе шэраг праблем, якія пакуль не ўдалося вырашыць. На абслугоўванні аднаго з таварыстваў уласнікаў Маскоўскага раёна сталіцы знаходзяцца 5 дамоў. Больш чым трэцяя частка кватэр — сацыяльныя. Як адзначае **старшыня таварыства Алена ВАКУНОВА,** сюды перасялілі людзей з прыватнага сектара, якія псуюць не толькі сваё жыллё, але і пад'езды. Пры гэтым церпіць уласная маёмасць дома, а выдаткі нясуць іншыя ўласнікі. Як тут быць? Пытанне застаецца без адказу на працягу ўжо некалькіх гадоў. Як заўважаюць у Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі, паколькі сацыяльныя кватэры знаходзяцца ў камунальнай уласнасці, то неабходна звяртацца ў мясцовыя органы ўлады. Цяжкасці ўзніклі і ў сталічным ЖБК № 648. Як паведаміў **старшыня будкааператыва Уладзімір МЯЛЕШКА,** у доме шмат аднапакаёвых кватэр, праз якія праходзіць вялікая колькасць жыхароў. Праз пэўны час яны паляпшаюць жыллёвыя ўмовы і з'язджаюць. Па заканадаўстве ўласнікі, якія набылі кватэру, могуць па выбары ўступіць у ЖБК альбо не ўступіць. І, адпаведна, нельга іх прымусіць несці выдаткі па ўтрыманні дома. Як лічыць Уладзімір Мялешка, такі ўдзел павінен быць дакладна вызначаны, каб не ўзнікала няроўнасці паміж жыхарамі.

Відавочна, што і такія спрэчныя моманты павінны знайсці заканадаўчае вырашэнне. Вядома, шмат залежыць ад саміх жыхароў, аднак і без падтрымкі дзяржавы людзям даволі складана будзе наладзіць эфектыўную сістэму абслугоўвання жылля. Пакідаць гэтае надзённае пытанне без увагі проста нельга.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Абзац

■ У Беларусі больш нараджаецца хлопчыкаў, чым дзяўчынак, падлічылі статыстыкі. Летась на свет з'явіліся 55 тыс. 563 хлопчыкі і 52 тыс. 347 дзяўчынак.

■ **У Новалукомлі сур'ёзна пацярпела ад пажару царква. Пажар у драўляным будынку храма Уваскрэсення Хрыстовага 1999 года пабудовы здарыўся з 3 на 4 сакавіка. Агнём пашкоджаны купал, сцены, маёмасць, дах на плошчы 60 кв.м. Пажарныя разам з мясцовымі жыхарамі выратавалі царкоўны рыштунак. Мяркуецца, што ўзгаранне адбылося з-за пакінутых без нагляду запаленых свечак.**

■ Тры чалавекі загінулі ў выніку ДТЗ у Сенненскім раёне. У выніку лабавога сутыкнення аўтамабіляў Фольксваген «Пасат» і Фольксваген «Крафтар» вадзіцель (жыхар Магілёўшчыны) і два пасажыры «Пасата» загінулі. Абставіны здарэння высвятляюцца.

■ **У Мінску вадзіцель аўтамабіля «Хундай» наехаў на 10-гадовага хлопчыка, які ішоў са школы дадому. Гэта здарылася на перакрыжаванні праспекта Дзяржынскага і вуліцы Шчорса. Школьнік пераходзіў дарогу па пешаходным пераходзе, які не рэгулюецца. Хлопчыка з пераломам пляча даставілі ў бальніцу. Як высветлілася, вадзіцель да гэтага быў пазбаўлены права кіравання транспартнымі сродкамі за перавышэнне хуткасці.**

■ У Пінскі ГАУС патэлефанавала невядомая і заявіла, што замініравана гімназія па вул. Рэвалюцыйнай і аддзяленне Галоўнага ўпраўлення Нацыянальнага Банку РБ па Брэсцкай вобласці. Аператыўныя спецгрупы эвакуявалі 1052 чалавекі, праверылі аб'екты, але нічога падазронага не знайшлі. Было выяўлена, што тэлефонны званок паступіў ад хворай, якая лечыцца ў абласной псіхбальніцы.

■ **У гонар свята, якое набліжаецца, — Міжнароднага жаночага дня — жанчыны Туркменіі атрымалі грашовы падарунак у памеры 40 манатаў (1 манат — 2,85 долара). Грашовыя падарункі выдаюцца ўсім жанчынам, незалежна ад узросту. І калі раней у дзіцячых садках і школах дзяўчаткі атрымлівалі падарункі на гэтую суму, то цяпер ім выдаюць выключна грашовыя знакі.**

■ Жыхар горада Першаўральск Свярдлоўскай вобласці, які сістэматычна ўключаў гучную музыку, рашэннем суда пазбаўлены кватэры. Беспрэцэдэнтнае рашэнне было прынятае ў дачыненні да дыджэя, які заяўляў, што музыка патрэбная яму для падрыхтоўкі да выступленняў. Летась у міліцыю ад яго суседзяў паступіла 16 заяў са скаргамі аб парушэнні грамадскага парадку як удзень, так і ноччу. Згодна з рашэннем суда, кватэра будзе прададзена з таргоў, а выручаную суму вернуць уладальніку жылля. Дыджэй мае намер абскардзіць рашэнне суда.

Поўны абзац

■ Жыхарка амерыканскага штата Агаё была аштрафаваная на мінулым тыдні за стварэнне патэнцыйна небяспечнай сітуацыі на дарозе: знаходзячыся за рулём, жанчына адначасова карміла грудзямі сваю дачку. Маці чацвярых дзяцей была затрыманая пасля таго, як у паліцыю пазваніў іншы вадзіцель і расказаў, што жанчына за рулём міні-вэна Honda трымае на руках немаўля. У салоне знаходзіліся і яе астатнія трое дзяцей, якіх яна адвозіла ў школу. Ніхто з іх не быў прышпілены і не сядзеў у дзіцячым аўтакрэсле. Шматдзетнай маці пагражае штраф у памеры 1500-1800 долараў і да шасці месяцаў турмы. Сама жанчына не раскайваецца ў сваім учынку: «Калі маё дзіця галоднае, я буду яго карміць», — сказала яна журналістам.

■ **У Пензенскай вобласці вынесены прысуд жанчыне, якая скалечыла свайго мужа, калі той адмовіўся абіраць бульбу. Яна кінула нож прама ў вока сужэнцу. Жанчыну прыгаварылі да аднаго года і трох месяцаў пазбаўлення волі. Пасля адмовы мужчыны чысціць бульбу яна сама схапілася за нож і трапна паслала яго ў вока лянівага мужа. Больш за ўсё ў гэтай гісторыі здзіўляе тое, што пацярпелы звярнуўся да ўрача толькі праз тры дні і ўсяляк выгароджваў жонку. Вока чалавеку ўдалося захаваць, але ён на яго амаль не бачыць. Паколькі жанчына раней адбывала пакаранне за забойства, размовы пра ўмоўны тэрмін быць не магло, хоць пацярпелы і прасіў аб гэтым.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

«ПІЦЕ СОКІ, МУЖЫКІ!»

Здарэнне № 1

«Работнік аднаго з камунальных прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці памёр на працоўным месцы ад востраг атручэння алкаголем. Канцэнтрацыя спірту ў крыві склала 4,7 праміле».

Здарэнне № 2

«Вадзіцель пагрузчыка будаўнічай арганізацыі Магілёва, які знаходзіўся «падшафэ», зваліўся з вышыні і атрымаў смяротныя траўмы».

З 35 жыхароў Магілёўскай вобласці, якія загінулі на працоўным месцы, 15 — знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення.

Паводле слоў **пракурора аддзела па наглядзе за выкананнем правоў і свабод грамадзян Генеральнай пракуратуры Юрыя КАРПІЦКАГА,** на Магілёўшчыне летась у параўнанні з 2007 годам павялічылася колькасць няшчасных выпадкаў на вытворчасці (пераважна на сельскагаспадарчых, прамысловых, будаўнічых прадпрыемствах) са смяротным вынікам.

Узрасла і колькасць транспартных здарэнняў на дарогах вобласці, у тым ліку і з удзелам нецвярозых кіроўцаў. Напрыклад, работнік сельгасвытворчага кааператыва Слаўгарадскага раёна сеў за руль у нецвярозым стане і пазбавіў жыцця невінаватага чалавека. У Горацкім раёне таксама зафіксаваны факты здзяйснення ДТЗ работнікамі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, якія рухаліся на падпітку і без наяўнасці правоў на кіраванне транспартным сродкам.

— Адна з прычын негатыўнай тэндэнцыі ў тым, што на большай палове прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу не праводзіліся перадрэйсавыя медыцынскія агляды работнікаў, — падкрэсліў Юрый Карпіцкі.

Напрыклад, у Кіраўскім раёне камбайнера, які знаходзіўся ў крытычным стане алкагольнага ап'янення (4,3 праміле алкаголю ў крыві), дапусцілі да працы. У выніку ён не справіўся з кіраваннем і наехаў на свайго памочніка, які ад атрыманых траўмаў загінуў.

Толькі летась на рахунку нецвярозых больш як 32 тысячы злачынстваў. З 2662 асобаў, якія скончылі жыццё самагубствам, 60 працэнтаў знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. На наркалагічным уліку сёння стаіць больш як 180 тысяч чалавек, якія пакутуюць ад алкагалізму. У сувязі з тым, што алкагалізацыя насельніцтва становіцца нацыянальнай праблемай, Генеральная пракуратура прапаноўвае перапрафіляваць беларускія прадпрыемствы, якія выпускаюць пладова-ягадныя віны, на выпуск натуральных сокаў і іншых безалкагольных напояў.

— І рабіць гэта трэба паэтапна, — падкрэсліў Юрый Карпіцкі, — каб не дапусціць масавага скарачэння работнікаў на такіх прадпрыемствах. Разлічваем на падтрымку мясцовых органаў улады. Добра было б, каб у рэгіёнах, дзе функцыянуюць вінаробныя прадпрыемствы, актывізавалі работу па стварэнні дадатковых працоўных месцаў, развіцці новых відаў вытворчасці. Скарачэнне выпуску пладовага мацаванага віна значна не паўплывае на раённы мясцовы бюджэт.

У 2007 годзе ў нашай краіне выпушчана больш як 22 мільёны дэкалітраў пладова-ягаднага віна. За год дзеяння дзяржаўнай праграмы па барацьбе з п'янствам і алкагалізмам выпуск гэтай прадукцыі скараціўся на 6,3 %.

— У пачатку года мы правялі выбарачную праверку прадпрыемстваў, якія выпускаюць віно з пладова-ягаднай сыравіны, — паведаміў Юрый Карпіцкі. — З 18 праведзеных (усяго іх у рэспубліцы 63. — **Н. Д.**) 8 вінаробных прадпрыемстваў, у тым ліку Полацкі, Слуцкі, Клецкі вінзаводы, не толькі не выканалі патрабаванняў па скарачэнні выпуску аб'ёмаў мацаванага віна, але і дапусцілі рост выпуску гэтай прадукцыі больш чым на 10 працэнтаў.

— Тым вінаробным прадпрыемствам, якія будуць і далей ігнараваць патрабаванні дзяржаўнай праграмы аб скарачэнні штогод аб'ёмаў выпуску мацаванага віна, будзе павялічана стаўка акцызаў на тую частку прадукцыі, якая выпускаецца звыш вызначанай нормы.

Акрамя таго, Генпракуратура выступае за павышэнне ўзроставага абмежавання на продаж алкаголю з 18 да 21 года.

— Сёння мы патрабуем павышэння адказнасці тых асобаў, якія прадаюць алкагольныя напоі няпоўнагадовым. Але супрацоўніка міліцыі не паставіш побач з кожным касірам. Акрамя таго, ёсць выпадкі, калі моладзь просіць дарослых набыць для іх спіртное. Такія факты складана выявіць. Таму вельмі важна сфарміраваць у свядомасці кожнага грамадзяніна разуменне, што спойваючы маладое пакаленне, мы не пабудуем светлай будучыні.

Надзея ДРЫЛА.

РАЗАМ З МАНЕКЕНАМ

У краму «Поры года» ў Баранавічах, ускочыў невядомы, схапіў манекен, апрануты ў світэр і куртку, ды збег з ім. Злодзей выяўлены, і цяпер яго шукаюць.

АДКУЛЬ ЗОЛАТА І СРЭБРА?

Супрацоўнікамі Брэсцкага РАУС была затрымана грамадзянка, якая займалася продажам ювелірных вырабаў. У яе канфіскавана 226 залатых і срэбных упрыгажэнняў вагой 800 грамаў на 90 млн рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

З нагоды

«7 ДНЯМ» — ДОЎГІХ ДЗЁН

Сёння свет пабачыў тысячны нумар штотыднёвіка «7 дней» — газеты, якая грунтуецца на трох «кітах». Па-першае, выданне вылучаецца высокім для сучаснага дня тыражом — звыш 40 тысяч экзэмпляраў, прычым ведамасная падпіска не перавышае літаральна 2 тысяч. Па-другое, валодае аб'ектыўнай магчымасцю адбіраць найбольш цікавую з усёй (без перабольшання) інфармацыі, паколькі заснавальнік газеты — Беларускае тэлеграфнае агенцтва. Па-трэцяе, штотыднёвік працуе без датацый і з прыбыткам.

Першы нумар падпісаў у студзені 1990 года галоўны рэдактар Анатоль Пранішнікаў. Паводле яго слоў, гаворка тады ішла пра стварэнне інфармацыйна-праблемнага выдання накшталт «Аргументов и фактов», заснаванага на беларускім матэрыяле. «Мы ніколі не імкнуліся выказаць сваё меркаванне, мы давалі слова людзям, якія прымаюць рашэнні, тым, на каго гэтыя рашэнні ўплываюць, — сказаў Анатоль Сямёнавіч у сваім інтэрв'ю газеце з нагоды 15-годдзя выдання. — Мы выходзілі з таго, што журналіст — не месія, не іншынер чалавечых душ, не настаўнік і не суддзя, ён — летапісец свайго часу, своеасаблівы перадатчык інфармацыі свайму чытачу».

Анатолю Сямёнавічу належыць і аўтарства імені газеты. Імя, як вядома, і цяпер застаецца нязменным. Пра тое ж, ці мянялася штосьці ў самім выданні, расказаў цяперашні, трэці па ліку, галоўны рэдактар «7 дней» Віктар ЧЫКІН, які кіруе працэсам з 2001 года. Невялічкае інтэрв'ю з Віктарам Валянцінавічам у сувязі з выхадам тысячнага нумара выдання можна лічыць своеасаблівай падрыхтоўкай да святкавання 20-гадовага юбілею, які газета адзначыць выхадам першага студзеньскага нумара ўжо наступнага года.

— Як вы лічыце, Віктар Валянцінавіч, газета ўвогуле і «7 дней» у прыватнасці павінна пастаянна мяняцца ці ўсё ж такі лепей трымацца кансерватызму, не «палохаць» чытача наватарствам?

— Думаю, у зменах няма нічога дрэннага. Галоўнае, каб яны былі да лепшага. Наша газета мянялася досыць часта. Дастаткова сказаць, што калі газета пачала выходзіць, то была чорна-белай, на васьмі старонках, а цяпер у нас 32 старонкі, чатыры з якіх — поўнакаляровыя... Напэўна, справа не ўласна ў пераменах ці іх адсутнасці. Выданне павінна быць цікавым.

— Раней «7 дней» пазіцыянавала сябе як выданне інфармацыйна-праблемнае. Яно і цяпер застаецца такім?

— Мы пазіцыянуем сябе ўжо як газета для ўсёй сям'і, пра што сведчаць старонка для дзяцей «Ладушкі», для жанчын — «Жаночы клуб»... Ніякіх іншых заяў не робім. Дзякуючы заснавальніку — БелТА, — мы, што называецца, непасрэдна маем пад рукой самую поўную, рознабаковую інфармацыю. Аднак «7 дней» — гэта штотыднёвік, і мы павінны адбіраць тое, што доўга не страчвае сваёй актуальнасці. Таму стаўка робіцца не столькі на факты, колькі на іх падачу, а дакладней, на аналітыку. Гэта наогул тэндэнцыя нашага часу. Газетам, нават штодзённым, даволі цяжка спаборнічаць па аператыўнасці з тэленавінамі і інтэрнэтам. Таму аналітыкі ў сучасных перыядычных выданнях, лічу, павінна з'яўляцца ўсё больш. Цяпер і ў тых жа «Аргументах и фактах» больш за палову публікацый — аналітычнага характару.

— Наколькі я разумею, газета ўжо не спрабуе ні ўпадабняцца, ні канкурыраваць з «АиФ»?

— Мы заўсёды жылі сваім розумам і нікога не капіравалі. З пачаткам існавання знайшлі сваю нішу, выпрацавалі свой стыль і займелі сваё кола падпісчыкаў. Пра што, дарэчы, сведчыць і той факт, што летась газета стала лаўрэатам нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара».

— Раскажыце праўду: як вам жывецца ва ўмовах крызісу?

— Мы яго не адчуваем. Па вялікім рахунку, у нас няма значных фінансавых праблем. Гэта праўда. Без лішняй сціпласці магу сказаць, што мы адна з нямногіх газет, якая не карыстаецца дзяржаўнымі датацыямі. «7 дней» — прыбытковая газета. За кошт індывідуальнай падпіскі і рэкламы. Яшчэ адна асабівасць — у нас усяго восем журналістаў, якія пішуць. У асноўным яны і ствараюць нумар, хоць ёсць і невялікая колькасць пазаштатных аўтараў.

— Вам лёгка са сваім заснавальнікам?

— Узаемаразуменне знаходзім заўсёды. Заснавальнік сур'ёзны. І галоўная перавага тут — забяспечанасць інфармацыяй. Да таго ж, журналісты БелТА робяць паводле пэўнай інфармацыі больш пашыраныя, аналітычныя, як я казаў, артыкулы. Гэта эксклюзіў.

— Чытачам газеты чакаць якіх-небудзь змен у бліжэйшай будучыні?

— Ёсць некаторыя разважанні адносна таго, каб павялічыць палоснасць, раздзяліць «рабочыя» палосы і рэкламу. Адназначна можна гарантаваць нашым падпісчыкам: у найбліжэйшы час газета стане яшчэ больш цікавай. У калектыву ёсць шмат творчых планаў і задум.

— Як вы лічыце, суайчыннікі маюць патрэбу ў чытанні перыёдыкі?

— Хутчэй, ёсць людзі, якія выхаваны на гэтым. Пакуль жыве гэта пакаленне, будуць жыць і газеты. Моладзь апошнія не чытае... Безумоўна, робім інтэрнэт-версію выдання...

— Самі як часта чытаеце газеты?

— Рэгулярна... У інтэрнэце.

— Ёсць рызыка, што газет у найбліжэйшы час стане менш?

— Гэта залежыць ад тых, хто іх робіць. Каб выжыць, неабходна знайсці сваю нішу, як бы банальна гэта ні прагучала. У нейкай ступені можна пагадзіцца з думкай пра тое, што столькі штодзённых выданняў, колькі ёсць цяпер, рэспубліцы не патрэбна... Змяншэнне колькасці выданняў — напэўна, нармальны працэс.

— Дзякуй за гутарку! «Звязда» жадае «7 дням» як мага больш доўгіх дзён. І з пачынам вас — першым крокам насустрач нумару 2-тысячнаму.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Падарункі грамадзяніну начальніку

Начальнік падраздзялення папраўчай калоніі ў Оршы аказваў зняволеным паслугі за каштоўныя падарункі.

Пра гэта паведаміў пракурор аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў на крымінальных справах і аналізе судовай практыкі пракуратуры Віцебскай вобласці Дзмітрый Арэхва.

Кіраўнік падраздзялення абавязаны быў спыняць каналы паступлення забароненых прадметаў зняволеным. Аднак ён вырашыў атрымаць са свайго статусу асабістую выгаду. За аказаныя паслугі грошай начальнік не браў — толькі каштоўныя падарункі. Судом даказана, што за перадачу двух мабільных тэлефонаў, якімі асуджаны карыстаўся паводле свайго меркавання на працягу доўгага часу, ён атрымаў вадкакрышталічны тэлевізар і некалькі бутэлек дарагіх спіртных напояў. Яго таксама абвінавачвалі ў арганізацыі працяглых спатканняў зняволеных з жанчынамі, але гэтыя факты не ўдалося пацвердзіць.

За незаконныя дзеянні былы начальнік асуджаны да шасці гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць пасады прадстаўніка ўлады на тры гады. Акрамя таго, з яго спагнаны кошт незаконна атрыманых прэзентаў.

Вольга БАГАЧОВА, БЕЛТА.

ОАО «Славянский Союз»

извещает о проведении очередного общего собрания акционеров, которое состоится 31.03.2009 г. по адресу: г. Орша, ул. Замковая, д. 11, к. 1.

Начало регистрации в 10.00, начало собрания в 11.00

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет дирекции об итогах деятельности Общества за 2008 г.
2. О годовом балансе и отчете о прибылях и убытках Общества за 2008 г.
3. О распределении чистой прибыли Общества за 2008 г.
4. Избрание совета директоров и ревизора Общества.
5. О ликвидации.

При себе необходимо иметь:

● акционеру — документ, удостоверяющий личность;

● представителю акционера — доверенность, оформленную в соответствии с законодательством.

С материалами повестки дня можно ознакомиться по адресу: г. Орша, ул. Замковая, 11 с 9.00 до 18.00.

УНП 300257402 **Совет директоров**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объектов республиканской собственности с установлением начальной цены продажи равной одной базовой величине и права заключения договоров аренды земельных участков

	Лот №1	Лот №2
Предмет аукциона	**Капитальное строение (инв. № 410/С-15370) и право заключения договора аренды земельного участка** для обслуживания строения	**Незаконсервированное не завершенное строительством капитальное строение «Производственный корпус для обработки семян» и право заключения договора аренды земельного участка** для обслуживания не завершенного строительством объекта
Место нахождения объектов	Гродненская обл., Волковысский р-н, д. Изабелин, ул. Южная, д. 4а	Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Свердлова, 203 (Лида-14, Северный промузел)
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	193,207	87 583,710
Сумма задатка, тыс. рублей	19,000	8 758,000
Продавец недвижимого имущества (наименование, тел.)	Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», контактный телефон: (8 0152) 74 43 96	Республиканское унитарное предприятие «Гродносортсемовощ», контактные телефоны: (8 01561) 5 82 30, 5 82 32
Характеристика объектов недвижимого имущества	**Здание аптеки № 106 с верандой и сенями** – отдельно стоящее одноэтажное, 1960 года постройки, площадь 65,1 кв. м, объем 180 куб. м; фундамент бутобетонный, наружные и внутренние стены сборно-щитовые, обложены кирпичом, перекрытия чердачные деревянные, крыша шиферная двухскатная, полы дощатые; отопление печное, электроосвещение – открытая проводка; **сарай** – площадь застройки 38 кв. м, фундамент бутобетонный, стены кирпичные, крыша шиферная; **уборная** – площадь застройки 1 кв. м, фундамент – бутобетонные столбы, стены дощатые, крыша шиферная; **мощение** – 7 кв. м, литый бетон	Не завершенный строительством корпус для обработки семян – одно-, двухэтажное здание, площадь застройки 1927 кв. м, строительный объем 13213 куб. м, наружные стены из железобетонных плит и кирпича, несущие конструкции кровли – железобетонные сборные балки, фундамент – монолитный; фундаментные балки, блоки стен подвала, колонны, балки и стеновые панели – сборные железобетонные; внутренние перегородки – частично из кирпича, частично из железобетонных плит, полы бетонные, оконные и дверные проемы не заполнены, отделка отсутствует, стены, перегородки, перекрытия требуют текущего ремонта; дата начала и окончания строительства: 1992 г. – 1995 г., общая степень готовности 54,9 %
Условия использования недвижимого имущества	Осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте и создание рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи	Завершение строительства объекта в течение двух лет после заключения договора купли-продажи; осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте, создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи
Информация о земельном участке (площадь, срок аренды)	Площадь земельного участка 0,0537 га, кадастровый номер 420882503101000153. Срок договора аренды земельного участка 50 лет	Площадь земельного участка 1,5117 га, кадастровый номер 423650100001000436. Срок договора аренды земельного участка 50 лет
Условия использования земельного участка; ограничения по использованию земельного участка	Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта в срок, не превышающий 2 лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. Водоохранная зона водного объекта вне прибрежных полос – 0,0537 га; охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 вольт – 0,0026 га	Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ в случае изменения функционального назначения объекта; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией
Организатор аукциона (наименование, адрес, тел.)	Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул.17 Сентября, 39, тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней)	

1. Аукцион состоится **6 апреля 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона по **3 апреля 2009 года до 16.00** по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, **кабинет 6.**

3. К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет Организатора аукциона;

- юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

- индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации;

- иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

- представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

4. Сумма задатка переч

«Шчаслівы білет для Астравецкага раёна»

— Менавіта так ахарактарызаваў перспектывы будаўніцтва атамнай электрастанцыі на тэрыторыі Астравецкага раёна старшыня райвыканкама Адам КАВАЛЬКА на сустрэчы вучоных і спецыялістаў-удзельнікаў праекта будаўніцтва і навуковага суправаджэння будаўніцтва АЭС у Рэспубліцы Беларусь з жыхарамі і прадстаўнікамі грамадскасці Астравецкага раёна. АЭС патрэбна для ўсёй нашай краіны, адзначыў Адам Кавалька, але выгоды для мясцовых жыхароў Астравеччыны таксама відавочныя. Гэта станоўча адаб'ецца і на эканоміцы раёна, і на занятасці насельніцтва.

Любая інавацыя, тым больш такая маштабная і звязаная з укараненнем новых тэхналогій, у тым ліку і ядзерных, дае штуршок да развіцця як краіны ў цэлым (атрыманне новых крыніц энергіі, павышэнне энергетычнай бяспекі), так і асобнага рэгіёна (забеспячэнне энергіяй тэрыторыі Астравецкага раёна і сумежных рэгіёнаў, стварэнне новых працоўных месцаў). Пра гэта паведаміла прысутным **дырэктар Дэпартамента па гідраметэаралогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Марыя ГЕРМЕНЧУК.** Незалежна ад таго, дзе канкрэтна будзе пабудавана беларуская АЭС, усе рацыянальныя працэдуры і міжнародныя абавязацельствы, якія ўзяла на сябе наша краіна ў сувязі з будаўніцтвам АЭС, будуць выкананы ў поўным аб'ёме. У краіне ўжо створана нарматыўна-прававая і нарматыўна-тэхнічная база, якая дакладна апісвае ўсю паслядоўнасць крокаў пры ўзвядзенні атамнай электрастанцыі. Асаблівая ўвага надаецца забеспячэнню радыяцыйнай бяспекі як для навакольнага асяроддзя, так і для насельніцтва. Наяўная нарматыўная база дазваляе стварацьдакументы, якія потым дазволяць гарантаваць, што пры эксплуатацыі такога складанага аб'екта, як атамная станцыя, рызыка забруджвання (ва ўмовах новых тэхналогій і таго ўзроўню развіцця навукі і тэхнікі, які мы маем сёння) будзе мінімальнай. Зараз вядзецца ацэнка ўздзеяння на навакольнае асяроддзе — складаны комплекс задач, прызваны ацаніць магчымае ўздзеянне на акаляючае асяроддзе, каб пры праектаванні АЭС звесці яго да мінімуму. Як патлумачыла Марыя Герменчук, у Беларусі даўно існуе разгалінаваная сетка радыяцыйнага манітарынгу атмасфернага паветра, паверхневых вод і глебы, які дазваляе кантраляваць сітуацыю, ацэньваць яе развіццё і рабіць прагнозы на будучыню. Акрамя таго, для забеспячэння радыяцыйнай бяспекі насельніцтва і тэрыторыі ў краіне створаны 4 аўтаматызаваныя сістэмы кантролю радыяцыйнай абстаноўкі ў зонах уплыву атамных станцый, якія размяшчаюцца на тэрыторыі суседніх дзяржаў уздоўж мяжы Беларусі. Досвед і навуковы патэнцыял, якім валодаюць беларускія навукоўцы, дазваляе забяспечыць радыяцыйную бяспеку пры будаўніцтве атамнай станцыі на тэрыторыі нашай краіны.

У Беларусі яшчэ ў 50-я гады была створана і дзейнічае зараз служба радыяцыйнай гігіены, патлумачыў **прафесар кафедры гігіены і медыцынскай экалогіі БМАПА Уладзімір ЦЯРНОЎ.** Міністэрства аховы здароўя мае багаты досвед кантролю за выкарыстаннем крыніц іанізуючага выпраменьвання і гарантуе выкананне ўсіх міжнародных нормаў радыяцыйнай бяспекі на ўсіх этапах узвядзення атамнай станцыі. Кадравы, навуковы, тэхнічны патэнцыял для гэтага ў нас ёсць.

Як вядома, ні адна з трох прапанаваных пляцовак па геалагічных умовах не мае фактараў забароны для будаўніцтва АЭС, аднак пасля праведзенага комплексу геолага-разведачных работ менавіта Астравецкая была абрана ў якасці прыярытэтнай.

Мясцовых жыхароў, якія прыйшлі на сустрэчу з вучонымі, асабліва хвалявала, якой будзе зона адсялення пры ўзнікненні аварыйнай сітуацыі і якімі ўвогуле могуць быць наступствы аварыі. На гэтае пытанне адказаў **інжынер вытворча-тэхнічнага аддзела Дырэкцыі будаўніцтва атамнай электрастанцыі Уладзімір ПЕТРУШКЕВІЧ.** Паводле яго слоў, уся сістэма бяспекі атамнай станцыі новага пакалення (менавіта такую мы будзем узводзіць) пабудавана такім чынам, каб выхаду радыяцыі за межы станцыі нават у выпадку аварыі не адбылося. Сістэма лакалізацыі аварыі (хаця працэнт верагоднасці яе ўзнікнення выключна нізкі) забяспечвае абмежаванне распаўсюджвання радыеактыўнасці ў межах тэрыторыі станцыі. Тэарэтычна прадугледжаная зона эвакуацыі складае ўсяго 800 метраў ад рэактара, значыць, эвакуацыя будзе праходзіць на тэрыторыі станцыі. Сістэма бяспекі АЭС новага пакалення забяспечвае бяспеку ў аварыйнай сітуацыі ў межах свайго перыметра, падкрэсліў Уладзімір Петрушкевіч.

Цікавіліся мясцовыя жыхары рэальнымі перспектывамі развіцця Астравецкага рэгіёна, у прыватнасці, стварэннем новых працоўных месцаў.

Калі кропка ў пытанні выбару пляцоўкі пад АЭС будзе пастаўлена, пачнуцца актыўныя падрыхтоўчыя работы, запэўніў прысутных **намеснік дырэктара па капітальным будаўніцтве Дырэкцыі будаўніцтва атамнай электрастанцыі Андрэй БАРКУН.** З улікам таго, што Астравецкая пляцоўка абрана прыярытэтнай, пэўны задзел трэба зрабіць у самы бліжэйшы час. Жыхары Астраўца ўжо ведаюць, што хутка тут пачнецца будаўніцтва жылых дамоў для рассялення будаўнічага персаналу, які спатрэбіцца для правядзення асноўных работ па ўзвядзенні станцыі. Нават калі станцыю вырашаць будаваць у іншым месцы, жыллё не застанецца незапатрабаваным. Калі ж для беларускай АЭС пакінуць Астравецкую пляцоўку, у перспектыве Астравец ператворыцца ў горад з 30-тысячным насельніцтвам (сёння ў ім 8,5 тысяч жыхароў). Тут будуць узведзены новыя жылыя дамы (як катэджнага тыпу, так і шматпавярховікі), спартыўныя збудаванні, установы культуры, адукацыі, аховы здароўя, Палац шлюбу, гасцініцы, культавыя пабудовы, паркі, скверы, будзе пракладзена адпаведная інжынерная інфраструктура, магчыма, з'явяцца і тралейбусы. Не абыдзецца без вучэбна-трэнажорнага цэнтра для работнікаў АЭС і інфармацыйнага цэнтра для сувязяў з грамадскасцю. Для забеспячэння жаночай занятасці ў павялічаным горадзе мяркуецца стварэнне новага вытворчага прадпрыемства радыётэхнічнай скіраванасці.

Інга МІНДАЛЁВА,
Астравецкі раён.

Лекавая падказка

НАВУКА РАСПАЗНАННЯ БОЛЮ

(Пачатак у нумарах за 6, 7, 11, 14, 17 лютага.)

ГАЛАЎНЫ БОЛЬ

У некаторых выпадках галаўны боль можа папярэджваць аб сур'ёзных праблемах са здароўем. Вось некаторыя разнавіднасці такога кшталту боляў і некаторыя хваробы, якія могуць выклікаць галаўны боль.

ПУХЛІНЫ МОЗГУ

Вельмі рэдкая прычына галаўнога болю. Ціск ад пухліны можа выклікаць хранічны або перыядычны галаўны боль у чалавека, не схільнага да апошняга. Пры такім стане можа назірацца слабасць, нязграбнасць, змяненні зрокавых вобразаў, змяненні ў паводзінах, рвота.

СКРОНЕВЫ АРТЭРЫІТ

Галаўны боль можа быць сярэднім ці моцным. Скура на адным з бакоў твару каля вуха і скроні адчувальная да дотыку. Могуць быць гарачка і боль у мышцах пляча і сцёгнаў.

ЭНЦЭФАЛІТ

Галаўны боль звязаны з гарачкай і часам болем за вачыма. Сімптомы могуць абвастрацца на святле. Можна адчуваць кволасць, блытаніну ў галаве і змены ў эмацыянальным стане.

ПАБОЧНЫЯ ЭФЕКТЫ АД ЛЕКАЎ

Галаўныя болі могуць быць пабочным эфектам ад многіх лекаў. Для прыкладу можна назваць солі азотнай кіслаты, некаторыя антыбіётыкі і аральныя супрацьзачаткавыя сродкі.

МЕНІНГІТ

Такі від галаўнога болю асацыюецца з гарачкай, болем у шыі і зменай эмацыянальнага стану. Спробы нахіляць шыю толькі ўзмацняюць боль.

МІГРЭНІ

Ім могуць папярэднічаць візуальныя сімптомы, такія, як яркія або афарбаваныя светлыя плямы або зігзагі ў полі зроку. Галаўны боль можа суправаджацца ванітаваннем і рвотай.

БОЛЬ У ШЫЙНЫМ АДДЗЕЛЕ

Рэзкі боль у задняй частцы шыі часта пераходзіць за вуха з аднаго з бакоў чэрапа. Непрыемныя адчуванні часта могуць паўтарацца пры моцным націсканні на косны выступ на задняй баку шыі, там, дзе размешчаны патылічны нерв.

Святлана БАРЫСЕНКА.
(Працяг будзе.)

У СРОДКАХ ДЛЯ МЫЦЦЯ — «МІНА» ПАВОЛЬНАГА ДЗЕЯННЯ

Пасля мыцця посуду або адзення скура рук стала вельмі сухой? Гэта пастараліся павярхоўна-актыўныя рэчывы, аснова ўсіх сродкаў для мыцця. Яны настолькі актыўныя, што выдаляюць не толькі тлушч і бруд, але і пазбаўляюць скуру абарончай ліпіднай плёнкі, абястлушчваюць яе, выклікаюць экзэмы, дэрматыты і запаленні. Асабліва агрэсіўныя — аніённыя павярхоўна-актыўныя рэчывы. У Заходняй Еўропе, напрыклад, іх выкарыстанне ў пральных парашках жорстка абмежавана і не павінна перавышаць 2-7 працэнтаў, у той час як на нашым рынку сустракаюцца парашкі з 5-15 працэнтным іх утрыманнем.

Асабліва небяспечныя аніённыя рэчывы ў кампаніі з фасфатнымі дабаўкамі. У складзе парашкоў яны фігуруюць як фасфаты. Апошнія змякчаюць ваду, узмацняюць дзеянне павярхоўна-актыўных рэчываў, у тым ліку і таксічнае. Скура яшчэ хутчэй абястлушчваецца, бар'ерная функцыя яшчэ больш зніжаецца. Шкодныя рэчывы пранікаюць у мікрасасуды скуры, усмоктваюцца ў кроў і распаўсюджваюцца па арганізме. Гэта паступова прыводзіць да змянення фізіка-хімічных паказчыкаў самой крыві, парушэння імунітэту, развіцця алергіі, паражэння мозгу, печані, нырак, лёгкіх...

Ці варта гаварыць, што практычна ўсе сінтэтычныя сродкі для мыцця не раскладаюцца і таму назапашваюцца ў навакольным асяроддзі? Трапляючы ў вадаёмы, яны стымулююць рост водарасцяў. У выніку ў вадзе змяншаецца ўтрыманне кісларoду, і ўсё жывое гіне.

У Германіі, Італіі, Аўстрыі, Нарвегіі, Швейцарыі і Японіі парашкі з фасфатамі даўно забаронены. Законы аб забароне фасфатаў у пральна-мыйных сродках дзейнічаюць у Карэі, Тайвані, Ганконгу, Тайландзе, Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы.

А цяпер звярніце ўвагу на які-небудзь сродак для мыцця ў вашым доме: хутчэй за ўсё, там будзе фасфатная дабаўка. За мяжой замест фасфатаў у пральныя парашкі ўводзяць біялагічна інертныя, экалагічна бяспечныя рэчывы — цэаліты. За чвэрць стагоддзя, на працягу якога іх выкарыстоўваюць, усе пераканаліся ў іх перавагах і бясшкоднасці.

Дарэчы, тыя фірмы, якія ў сваіх краінах выпускаюць бесфасфатныя парашкі з цэалітам, у нас пад тымі ж гандлёвымі маркамі вырабляюць парашкі з фасфатамі. Кампанія «Procter & Gamble» яшчэ ў 80-я гады мінулага стагоддзя вырабляла «Арыэль» са зменшаным утрыманнем фасфатаў і наогул без іх. Аднак для постсавецкага рынку шэраг парашкоў вырабляецца з фасфатамі.

Змагацца з фасфатамі складана, і тым не менш, паспрабуем вытрымліваць некаторыя правілы бяспекі:

- мыйце адзенне і посуд у пальчатках, не кантактуйце з парашкамі;
- старанна выпалосквайце рэчы (не менш за 8 разоў) і выкарыстоўвайце толькі гарачую (не менш за 50-60 градусаў) ваду. У халоднай вадзе фасфаты практычна не выпалоскваюцца. Мацней за ўсё павярхоўна-актыўныя рэчывы трымаюць шарсцяныя, паўшарсцяныя і баваўняныя тканіны. Небяспечныя канцэнтрацыі ПАРаў захоўваюцца на тканінах да чатырох сутак;
- імкніцеся доўга не знаходзіцца ў памяшканні, дзе мыецца бялізна, па магчымасці праветрывайце кватэру;
- не забывайцеся на старыя добрыя спосабы барацьбы з брудам.

Напрыклад, харчовая сода — добры сродак для мыцця посуду. Дадайце да содава-мыльнага раствору нашатырны спірт — і атрымаеце сродак для мыцця фарбаваных паверхняў.

Пяціпрацэнтны воцат, які прадаецца ў любой краме, забівае 99 працэнтаў бактэрый, 82 працэнты цвілі і 80 працэнтаў вірусаў. Воцатам можна апрацоўваць край унітаза — проста распыліце і вытрыце. Ён таксама цудоўна спраўляецца з чысткай сценак ракавін або ванны, на якіх часта ўтвараецца шэравата-жоўты налёт — адкладанне мінеральных соляў з вады. Пакладзіце на забруджанае месца анучку, змочаную ў воцаце, і праз паўгадзіны налёту як не бывала.

Тлусты посуд адмые гарчычны парашок. Цудоўна змякчае ваду і растварае тлушч кальцыніраваная сода.

Вокны нашы бабулі мылі вадой з некалькімі чайнымі лыжкамі солі або спірту.

Каб прачысціць забруджанае калена ракавіны, засыпце туды сталовую лыжку пітной соды і адразу заліце шклянку воцату. Як толькі рэакцыя спыніцца, добра прамыйце трубу вадой.

Галіна ЧЫРАК, інструктар-валеолаг 18-й мінскай гарадской паліклінікі.

Валянцінкай Горкі мёд

Тая пятніца была, як... пятніца: Вадзік падчас абеду (абавязкі даўно падзелены) купіў хлеб, малако і гародніну, Каця зганяла на рынак па ўсё астатняе. Потым, бліжэй да вечара, ён забраў яе з працы, разам рванулі на дачу. Не адпачываць, не (да гэтага яшчэ, як да сонца было) — працаваць. У тую вясну ім далі пяць сотак няўдобіцы, на іх яны перавезлі старую бабуліну хатку. І ўжо сабралі, накрылі, паставілі вокны і дзверы — атрымаўся дамок. Хай маленькі, драўляны, але свой, уласны, які так хацелася да пачатку дажджоў абабіць прыгожай вагонкай, прааліфіць, а мо (калі пашанцуе з надвор'ем), нават пафарбаваць.

Бяда толькі — дні ўвосень кароткія.

Каб надтачыць іх, каб неяк урваць хоць гадзіну, з горада яны выязджалі па пятніцах...

У той раз нават выехалі ўжо. За пост ДАІ, за кальцавую... Адно — трэба было бензіну заліць.

Там, на запраўцы, абавязкі ў іх таксама дзяліліся: яна несла грошы ў касу, ён заставаўся ля машыны — рыхтаваў бензабак.

Не адзін (ад акенца ўбачыла Каця): ля машыны, побач з Вадзімам, тупаў нейкі мужык (здалёк — як шафа з антрэсолямі: такі ж высокі, шырокі)...

Аднак галасоў іх Каця не чула.

Вярнуўшыся да машыны, зразумела, чаму: муж — побач ні душы — на ўсялякі выпадак маўчаў, а «шафа» была безгалосай. Хрыпела адно:

— Падвязі, га, ну будзь чалавекам?! Я заплачу. Колькі скажаш, заплачу... Ёсць грошы. На, паглядзі — ё... Поўны кашалёк. І змёрз во, як цуцык. З гадзіну на дарозе стаяў — галасаваў, прасіўся... Ніхто не бярэ. Нават не спыняюцца, сукі...

Гледзячы збоку — дык нічога дзіўнага ў тым не было. Нават наадварот! «Галасоўшчыка» таго яшчэ і аб'язджаць маглі (на ўсялякі выпадак), бо менш, як на бандыта з вялікай дарогі ён не цягнуў — няскладны нейкі, дрэнна апрануты, баўдзілаваты... Да таго ж — «морда красная»... І алкаголем нясе... Можна сказаць, за вярсту.

— Ну, выпіў я! — Каціны думкі «счытаў» «хрыпач», — з паўлітра выпіў. Гарэлкі... З перцам. Паляваўся. Бо прастуджаны ж во...

— Самы час тады некуды ехаць — прабурчаў пасмялелы Вадзім, такі адчыніўшы перад ім дзверцы. Спадарожнік (пудоў сямі — гарантаваных) узрадавана сеў (машына адпаведна «лягля» — брухам, на асфальт), потым — па-гаспадарску ўладкаваўся-агледзеўся, прышпіліўся, уключыў святло ў салоне, зноў адкрыў свой поўны кашалёк — стаў карпатліва адлічваць нейкія паперкі, па адной, разважліва, складаць у «бардачок».

— Ты, часам, назад на дарогу не хочаш? — спытаў у яго Вадзім.

— Не, бронь Бог?! — спалохана прасіпеў пасажыр.

— То забяры свае грошы назад. І сядзі... Музыку во паслухай.

Аднак, скрыпка мужыка не прывабіла — ён неспакойна ёрзаў на месцы, ён, відавочна, хацеў, каб слухалі тут яго:

— Грошы што? — з усіх сіл засіпеў праз паўзу. — Яны ж і праўда — пыл. З табой, брат (Кацю мужык ва ўпор не бачыў), я і па-іншаму разлічыцца магу. Значыць так: яшчэ вёрст з дзесяць едзем па шашы, — ужо, лічы што, камандаваў ён, — а за тым — нейкіх пяць кіламетраў убок. І прыехалі, і на хутары мы. А там, у мяне, усяго — не мерана: дзве каровы, цялушка, конь, хлеў свіней, хлеў гусей, пчолы... Ты ж гарадскі будзеш, так? Дык я табе чаго хочаш дам! Сала возьмеш? А масла са смятанай?.. І бульбы, брат, колькі хочаш бяры, колькі павязеш!.. Ці не — г. усё гэта, — я табе мёду дам, свайго, чыстага.

Чаго ў гэтых словах болей было — шчырага жадання аддзячыць ці даехаць да хаты — думаць не хацелася. Зрэшты, Вадзім і не збіраўся гэта рабіць: ён адчуў, як падчас маналога жонка, седзячы ззаду, паклала яму руку на плячо, што азначала адно: «Трэба падвезці». Тое ж рашыў і сам. Бо шкада было гэтага вялікага няскладнага чалавека: дабрак, да таго ж — нездаровы ён, адназначна, бо ў салоне «грэў», як каларыфер у іх на дачы. І апрануты лёгка... А на дварэ, пакуль ехалі, усхадзіўся вецер, сцямнела.

Да таго ж — на тое, каб збочыць, падмывала яшчэ адно — чыста юначае ці нават дзіцячае: ні Каця, ні Вадзім яе ні разу ў жыцці не бачылі сапраўднага жывога хутара.

Кіламетры са тры да яго ехалі ці (так дакладней) калаціліся па гравійцы, якая болей нагадвала дошку для мыцця бялізны, потым рэзка звярнулі ўлева, паехалі ўніз, па полі — сярод якога, нарэшце, фары асвятлілі вялікі прыгожы востраў.

— Божухна! Вы тут жывяце?! — захоплена спытала ў спадарожніка Каця.

— Не, нас у бацькоў чацвёра. Тут нарадзіліся, у школу хадзілі. А цяпер — раз'ехаліся. Цяпер па гарадах усе. Бацька памёр. Толькі маці тут...

— Адна?! — жахнуліся разам сужэнцы.

— Ну...

— І не баіцца?!

— Не, яна ўжо прывыкла. Ды і сабака ў нас. Ведаеце які...

Пакуль гаварылі, машына ціхутка ўкацілася ў двор, абсаджаны высокімі дрэвамі, стала.

— Я выйду, — паспешна засіпеў пасажыр, — а ты (звярнуўся ён да Вадзіма, Кацю па-ранейшаму ён «не бачыў») можаш метраў сто праехаць наперад. Там развярнуцца лепей. А я — зараз, я мігам...

Мужык і сапраўды досыць спрытна выбраўся з машыны, подбегам рушыў да хаты.

Нейкі чорт, не іначай, падняў з месца і Кацю!

Выйшла следам, каб у атачэнні мноства нейкіх пабудоў убачыць вузкую, як пенал, прыземістую хату і свайго спадарожніка, які марна пагрукаўшы ў дзверы, зухавата сігануў праз плот да акна...

І каб раптам, здранцвеўшы ад жаху, пачуць (ці адчуць?), як за спінай... клацнуў затвор.

— Стаяць! — рашуча загадаў ёй хтосьці. — Хто такія? Што трэба?

— Нічога... Нам нічога не трэба! — заікаючыся прамовіла Каця. — Мы сына прывезлі...

— Якога?

— Хворага...

— Мае дзеці здаровыя, — не паверыў ёй голас. — Колькі чалавек у машыне?

— Адзін.

— Зараз праверым. Пірат, служыць.

Ззаду пачуліся крокі. На слупе коратка міргнула лямпачка. І Каця ў нейкім метры ад сябе жыўцом убачыла сабаку — сабаку Баскервіляў. Ён — вялізазны, калматы — сядзеў насупраць яе, напагатове і, здавалася, чакаў адно — каманды...

Замест яе — загарэлася такі святло на слупе... І ў вокнах. У хаце ляпнулі дзверы — на ганку з'явіўся той самы хворы.

— Пятро, гэта ты?! — здзіўлена спыталі з-за Кацінай спіны.

— Я, — прасіпеў мужык, падыходзячы да іх.

— А якога ж чорта (пераклад з мацернай. — **Аўт.**) ты голас не падаў?

— Дык асіп во... Няма голасу... Дзе я яго вазьму?

— Ты — асіп..., а каб я... пальнула цяпер... Тады б што?!

Каця павярнула галаву — гаварыла гэта высокая, худая кабета ў цёмнай, за шыю завязанай хустцы, у старой абарванай ватоўцы... Але больш за ўсё Кацю ўразілі рукі. Не тым, што трымалі зброю, — учарнелыя, з павернутымі кароткімі пальцамі, яны нагадвалі... лапы краба.

Гэта было апошнім, што яна паспела заўважыць — пад'ехаў муж, не выходзячы з машыны, адчыніў ёй дзверцы, яна ўвалілася ў салон.

— Пачакайце! А сала? А мёд? Мёду... Ну хоць мёду вазьміце — застукаў у шыбку былы спадарожнік.

— Ай, адчапіся, — усміхнуўся яму Вадзім, набіраючы хуткасць.

— Гэта што — так пахаладнела? — праз паўзу насцярожана спытаў ён у Каці, пачуўшы як яна (літаральна) ляпае зубамі.

— Ну, — ледзь выціснула тая.

— То добра мы зрабілі, што давезлі гэтага дзівака... Інакш, відаць, бяды было б: — чаго доўгага мог запаленне схапіць...

Што на тым хутары маглі «падхапіць» яны, да Каці «ў поўным аб'ёме» даходзіла цяжка. І пакрысе. Спачатку датумкала, што ў хутаран тых, відаць, дамова была — прыехаўшы, падаваць маці голас. А калі няма яго — гэта знак, што ля парога нехта чужы. І тады з хаты лепей выскачыць — праз акно, у бок саду. А далей ужо па абставінах — альбо ўцякаць, альбо з тым ваўкадавам заходзіць у тыл «праціўніку» і...

Ці страляла б яна, Каця не ведала.

Ведала (пасля тых выхадных, і дакладна), як небяспечна немаведама каго падбіраць на дарозе, як рызыкоўна ехаць немаведама куды (а тым больш — дзеля банальнай цікавасці)!

А яшчэ ёй было вельмі шкада тую адзінокую, спрацаваную, здзічэлую жанчыну, яна асуджала яе дзяцей, якія пакінулі (кінулі!) маці — адну. А трэба ж было (як спачатку здалося) хоць некаму, з чатырох, ды застацца.

«І што? — сама ў сябе пыталася потым, — пражыць жыццё — сваё, адно-адзінае — на востраве?! У непасільнай працы і турботах? Сплючы (а тым болей сёння...) у гумовіках і са стрэльбай у руках?»

...Гэтыя бясконца доўгія Каціны развагі ўсплылі ў памяці цяпер, калі зайшлі размовы (і, здаецца, сур'ёзныя?) пра тое, што трэба адрадзіць хутары.

Больш за тое — захацелася паўтарыць той «подзвіг Геракла» — праехаць па вядомай шашы, потым збочыць, адолець тры вярсты па гравійцы і потым яшчэ дзве па полі — паглядзець, што ж цяпер на тым хутары?

Была аказія — праехалі. Звярнулі. Спусціліся. Убачылі высокія прыгожыя дрэвы прысады і тое, што... засталося ад хаты-пеналу, ад хлеўчукоў і старога саду.

Сумнае відовішча.

Зрэшты, мы маглі памыліцца і трапіць зусім не туды.

Валянціна ДОЎНАР.

Утерянное страховое свидетельство по ОС ГО ВТС РБ серии АЖ № 2730548 считать недействительным.

ОТДЕЛ КУЛЬТУРЫ ЛУНИНЕЦКОГО РАЙОННОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ

ПРОВОДИТ ТЕНДЕР

на подрядные торги по текущему ремонту кинотеатра «Октябрь» в г. Лунинце на сумму 315 млн рублей.

Тендерные предложения принимаются в течение 10 дней со дня опубликования объявления.

Контактные телефоны: (01647) 2 15 45, 2 30 02, факс (01647) 2 25 66. УНН 200173942

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства гаража № 160 (общ. пл. 25,7 кв.м) с подвалом в ГСК «Свислочь» в г.п. Свислочь. Начальная цена снижена и составляет 3 417 550 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.08.2008 г. Аукцион состоится **24.03.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.03.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8017) 2246134. Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015



Любімага мужа і дарагога бацьку ***Яўгена Уладзіміравіча РАМАШКА*** *з горада Століна віншуем з юбілеем — 50-годдзем. Жадаем моцнага здароўя, даўгалецця, сямейнага дабрабыту, шчасця і поспеху у працы.*

Родныя.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2009 г. (млн. рублей)

ОАО «МИНСКТОРГМАШ»

г. Минск, ул. Промышленная, 22

АКТИВ	На конец отчетного периода
1. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ	
Основные средства (01, 02)	328
Нематериальные активы	—
Итого по разделу 1	**328**
2. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ	
Запасы и затраты	2
Дебиторская задолженность	23
Финансовые вложения	43
Денежные средства	24
Баланс	**420**
ПАССИВ	
3. ИСТОЧНИКИ СОБСТВЕННЫХ СРЕДСТВ	
Уставный фонд	62
Собственные (акции) доли, выкупленные у акционеров (учредителей)	
Добавочный фонд (83)	278
Нераспределенная прибыль (84)	65
Итого по разделу 3	**405**
5. РАСЧЕТЫ	
Кредиторская задолженность	15
Итого по разделу 5	**15**
Баланс	**420**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателя	За отчетный период
1. Доходы и расходы по видам деятельности	
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	186
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	19
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	167
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	136
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	**31**
2. Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	**1**
3. Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	
Прибыль (убыток) за отчетный период	**32**
Налоги и сборы производимые из прибыли	
Расходы и платежи из прибыли	—
Прибыль (убыток) к распределению	**32**

Директор **Гаврилова Н.А.**

Главный бухгалтер **Клименко С.И.**

На основании заключения аудитора бухгалтерская отчетность отражает достоверность финансово-хозяйственной деятельности. УНП 100103798

ГАЙНЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 5 (пяти) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

Лот 1 — земельный участок № 1 в д. Родевичи, площадью участка — 0,2282 га, кадастровый номер 623280810601000028, начальная цена 3423000 белорусских рублей;

Лот 2 — земельный участок № 2 в д. Родевичи, площадью 0,2282 га, кадастровый номер 623280810601000029, начальная цена 3423000 белорусских рублей;

Лот 3 — земельный участок № 3 в д. Родевичи, площадью 0,2431 га, кадастровый номер 623280810601000027, начальная цена 3647000 белорусских рублей;

Лот 4 — земельный участок № 4 в д. Родевичи, площадью 0,2394 га, кадастровый номер 623280810601000030, начальная цена 3591000 белорусских рублей;

Лот 5 — земельный участок № 3 в д. Домаши, площадью 0,2500 га, кадастровый номер 623280802601000034, начальная цена 3750000 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/счет № 3600619020025 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Логойск, МФО 153001518, УНП 600181697. Аукцион состоится **07.04.2009 г.** в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Гайна, ул. Советская, 14. Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **04.04.2009 г.** до 17.00 по адресу: Логойский район, д. Гайна, ул. Советская, д. 14.

Контактные телефоны: (8 01774) 58 2 35, 58 2 36, 56 4 98.

У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **ШМАТОК Святланы Рыгораўны,** 16 красавіка 1973 года нараджэння, ураджэнкі в. Карасцень Рэчыцкага раёна Гомельскай вобл., апошняе вядомае месца жыхарства: вул. Маладзёжная, д. 16, кв. 61, г. Рэчыца Гомельскай вобл.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Шматок С.Р., паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна (г. Рэчыца, вул. К. Маркса, д. 30) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ ЗАСО «Белнефтестрах» серия КС № 0060858 считать недействительным.

ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ СОВМЕСТНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло» и ЗАО «Амкодор-Унимод»

Собрание состоится 16 марта 2009 г. в 17.30 по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».

Регистрация участников Совместного Собрания производится в день и по месту проведения Собрания с 14.00 до 15.55.

Повестка дня:

1. Об увеличении размера уставного фонда ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».
2. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло» и утверждении его в новой редакции.

С информацией (материалами), подлежащими предоставлению акционерам при подготовке к проведению Собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 11 марта 2009 г. в приемной директора ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло» с 9.00 до 16.00, а в день проведения Собрания — по месту его проведения.

УНП 100010116 Наблюдательный Совет ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».

А беспрацоўных усё меней? Погляд

Класічны эканамічны крызіс — гэта падзенне вытворчасці і рост беспрацоўя. Гэтыя два паказчыкі цесна звязаны між сабой і па іх можна меркаваць, наколькі глыбокім з'яўляецца крызіс. Калі са спадам у прамысловасці малюнак меншбольш ясны, то з беспрацоўем сітуацыя незразумелая.

Здавалася б, найбольш праблемаў з працаўладкаваннем павінна быць у малых гарадах і пасёлках, бо там, як правіла, не дужа развіта прамысловасць, а рабочых рук заўсёды было багата. Але чытаючы статыстычныя зводкі, даводзіцца адзначыць, што на Брэстчыне склалася аптымістычная сітуацыя. Напрыклад, узровень беспрацоўя з 2,3 % у 2007 годзе знізіўся да 1,3 % на 1 студзеня 2009 года. Колькасць беспрацоўных па малых і сярэдніх гарадах знізілася ў 1,7 раза.

Нават у праблемных у гэтым плане гарадах беспрацоўе пайшло на спад: Іванава — з 3,4 % да 2 %, Драгічын — з 4 % да 1,8 %, Мікашэвічы — з 3,6 % да 1,9 %, Ганцавічы — з 3,5 % да 1,8 % ... і толькі ў Жабінцы беспрацоўных не паменшала.

А адзін з самых нізкіх узроўняў беспрацоўя ў Іванцэвічах (каля 1 %). Тут адкрыўся філіял ААТ «Атлант», на якім будзе працаваць да 162 чалавек, ды і ў цэлым гэты райцэнтр даволі насычаны прадпрыемствамі.

І ці можна гаварыць у такой сітуацыі пра крызіс? А можа, статыстыка ў нечым разыходзіцца з рэальным становішчам і не адлюстроўвае рэчаіснасць?

Добра, вышэй гаварылася пра малыя гарады, а якая сітуацыя з беспрацоўем у Баранавічах — буйным прамысловым цэнтры вобласці? Звярнуўся ў рэгіянальны Цэнтр занятасці насельніцтва.

— Калі параўнаць студзень-люты 2009 года з адпаведным перыядам мінулага, то маем даволі аптымістычныя вынікі. За гэтыя два крызісныя месяцы было зарэгістравана 920 беспрацоўных, а ў 2008 годзе — 1095 чалавек, узровень беспрацоўя знізіўся з 1,4 % да 1,1 %. І рабочыя месцы ёсць. Вось патрэбны вадзіцелі на шэраг прадпрыемстваў. Напрыклад, на малаказаводзе аклад вадзіцеля — 820 тысяч, на камбінаце хлебапрадуктаў — 500 тысяч... Іншая справа, што мы не можам усім прапанаваць работу па іх спецыяльнасці. Ёсць прафесіі, якія рынкам працы не запатрабаваныя, неабходна шукаць іншую работу, перакваліфікоўвацца, — распавяла начальнік упраўлення Таццяна Латышава.

Сітуацыя з беспрацоўем тым не менш неадназначная. Вялікай арміі беспрацоўных у

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



«САНТА-БАРБАРА» ПА-МІЛІЦЭЙСКУ

Ну і ну!

Як пашанцавала супрацоўнікам міліцыі: колькі любоўных гісторый даводзіцца назіраць ім па абавязку службы — абзайздросцішся. Іншы раз міліцыянеры становяцца сведкамі нястрымных, гарачых пачуццяў, якіх ні ў адным серыяле не ўбачыш. Ужо аднаго гэтага дастаткова, каб палюбіць сваю працу.

Ну вось, напрыклад, некалькі непрыдуманых гісторый, якія адбыліся ў Маскоўскім раёне нашай сталіцы.

Сюжэт з жыццёвай «мыльнай оперы». Мужчына вырашыў ажаніцца. Хутка маладая жонка нарадзіла яму дзіця, потым другое. Ці ж не шчасце гэта? Вядома, шчасце, а каб яно было яшчэ большым, праз пэўны час муж прывёў у хату яшчэ адну дзяўчыну, якая таксама падаравала каханаму дваіх дзяцей. Вось тут і пачаліся сапраўдныя пакуты ў нашага неўтаймоўнага палюбоўніка: дзве «жонкі» ў адной кватэры — як тут не памыліцца і выбраць «правільную»? Каб разабрацца ў такой няпростай сітуацыі, герой любоўнага трохкутніка неадкладна прыняўся выбіраць з жанчын лепшую: пажыў спачатку з «новай» — не спадабалася. Забраў свае рэчы і пераехаў да «старой» жонкі, у пакой насупраць. Потым яна чымсьці не дагадзіла — перабраўся да «навейшай». Такія пераезды кожны раз праходзілі са скандалам, бо трэба было дзяліць сумесна нажытую маёмасць з адной і перавозіць яе да другой гаспадыні. Але іх былая ўладальніца з такім дзеляжом звычайна не пагаджалася. Кожны раз, калі даводзілася наведваць гэту сям'ю (якую міліцыянеры ахрысцілі Санта-Барбара), участковы ў нерашучасці «таптаўся» ля парога: куды ж заходзіць на гэты раз — з якой маладзіцай цяпер жыве мужчына. А потым зразумеў: як толькі выклікаюць міліцыю — значыць, галава сям'і ў чарговы раз «змяніў» жонку.

Ці яшчэ адна падобная гісторыя. Жыла-была кабета, гора не ведала, пакуль аднойчы не адправіла мужа на бацькоўскі сход у школу да сына. І чаго толькі выпраўляла яго!? Звычайна ж сама хадзіла, бацька нават не ведаў, дзе і школа знаходзіцца. А тут... Ну дык вось. Пайшоў тата на той сход і сустрэўся з класным кіраўніком сына. Упадабаў жанчыну, а праз пэўны час тая самая класная дама нарадзіла дзіця ад бацькі свайго вучня і пераехала да каханага жыць. «Старой» жонцы гэтага чалавека толькі б радавацца: цяпер на бацькоўскія сходы хадзіць не трэба — класная тут жа, у суседнім пакоі жыве, калі што турбуе па вучобе сына — ідзі ды спытай. Ды і па прадмеце сваім таксама падцягнула б. Але чамусьці «былая» незадаволена: крычыць, скандаліць, міліцыю пачала часта выклікаць. Дзіўная нейкая кабета трапілася.

А вось яшчэ адна не менш дзіўная гісторыя. Кабета, чый муж пачаў дэбашырыць, выклікала міліцыю. Прыйшоў участковы. Гаспадар быў «пад мухай», але на пытанні рэагаваў адэкватна і адказы даваў зразумелыя.

— Чаго скандалім? — пытаецца супрацоўнік міліцыі.

— Ды вы разумееце, не магу я жыць з гэтай змяёй падкалоднай, жонкай маёй, так званай.

— Чаму ж?

— А палюбоўніка яна сабе завяла. Ды яшчэ не прызнаецца, кажа, што я з глузду з'ехаў на старасці.

— Можа, і праўда няма ніякага палюбоўніка? — кажа ўчастковы.

— Як жа няма!? — абурыўся гаспадар. — Мяркуйце самі: кожную раніцу ў адзін і той жа час мая жонка выпраўляецца на працу. Прычым едзе на адным і тым жа аўтобусе. Я за ёй сачыў і бачыў, што пасажыры там таксама адны і тыя ж. А значыць, сярод іх і «хаваецца» палюбоўнік. Праўда, ні з кім у «кантакт» яна не ўступала — напэўна, мяне заўважыла, падлюка, — мужчына так расхваліваўся, што, здаецца, гатовы быў праслязіцца ад жалю да самога сябе. Але міліцыянер паспрабаваў яго супакоіць і растлумачыў, што нічога дзіўнага ў тым, што жанчына едзе кожны дзень у адзін і той жа час на працу, няма: яна выбрала для сябе адпаведны маршрут, транспарт, бо ёй так зручна, такім чынам яна не спазняецца на працу. Іншыя пасажыры кіруюцца тым жа. Таму меркаванні гаспадара — глупства, і ніякага палюбоўніка жанчына не мае.

Мужчына і сапраўды супакоіўся, пагадзіўся, «адкланяўся» і вырашыў пайсці ў свой пакой, выспацца. Участковы застаўся з гаспадыняй, каб дапісаць такія-сякія паперы, бо кожны выклік міліцыі павінен быць пісьмова аформлены і адпаведна складзены.

Праз пяць хвілін са свайго пакоя прыбягае толькі што супакоены мужчына і зусім дзікімі вачыма пазірае на ўчастковага:

— Я ўсё зразумеў! — крычыць ён.

— Што вы зразумелі? — не зразумеў міліцыянер.

— Ты і ёсць палюбоўнік маёй жонкі!

Далей гаспадар паспрабаваў разабрацца з «палюбоўнікам» па-мужчынску, за што і быў дастаўлены ў аддзяленне міліцыі.

А ўвогуле, народ наш вельмі любіць супрацоўнікаў міліцыі: якіх толькі прычын не прыдумляюць людзі, каб у чарговы раз сустрэцца з ахоўнікамі правапарадку. То, бачыце, прусакоў у суседа зашмат і яны перабягаюць у іншыя кватэры; то вада ў чужой прыбіральні занадта гучна шуміць; то колер у карціны змяніўся, бо «ворагі» падмянілі; ці яшчэ якая навала турбуе бедных людзей. Іншы раз міліцыю выклікаюць не для пакарання каго-небудзь, а каб разумны чалавек дапамог разабрацца ў нялёгкім жыцці і даў карысную параду. Ну што тут скажаш!? Але ўсё ж супрацоўнікі міліцыі просяць вельмі добра падумаць перад тым, як набраць нумар «102»: а ці туды тэлефануеце, ці тая дапамога вам патрэбна?

Марына ЛЯВОШКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.48	17.55	11.07
Віцебск —	6.39	17.43	11.04
Магілёў —	6.38	17.45	11.07
Гомель —	6.33	17.43	11.10
Брэст —	7.03	18.10	11.07
Гродна —	7.02	18.12	11.10

Месяц

Першая квадра. Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Васіля, Ігната, Карнілы, Льва.*

К. *Адрыяна, Вацлава, Тэафіла, Фрэдэрыка.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

Варшава	+1..+3°С	Кіеў	-1..+1°С	Рыга	-1..+1°С
Вільнюс	-1..+1°С	Масква	-2..0°С	С.-Пецярбург	-2..0°С

Дзве даты

5 сакавіка

1534 год — нарадзіўся Васіль Цяпінскі, беларускі гуманіст-асветнік, пісьменнік і кнігавыдавец. Быў сучаснікам і аднадумцам Сымона Буднага, прадаўжальнікам гуманістычных і культурна-асветніцкіх традыцый Францыска Скарыны. Меў каштоўную бібліятэку. У сваім радавым памесці Цяпіна на Полаччыне заснаваў друкарню, у якой выдаў «Евангелле» і «Новы запавет». Дзейнасць Васіля Цяпінскага спрыяла зараджэнню, уздыму і кансалідацыі шырокага нацыянальна-культурнага і патрыятычнага руху ў Беларусі ў канцы XVI — пачатку XVII стагоддзя.

1558 год — у Еўропу ўпершыню быў завезены тытунь.

Цытата дня:

«Адзіны спосаб што-небудзь даведацца — гэта што-небудзь рабіць».

Джордж Бернард Шоу (1856—1950), англійскі драматург.

ДУША І ЦЕЛА

Здавён лічылася, што на Льва Катанскага (5 сакавіка — дзень ушанавання святога прападобнага Льва, епіскапа Катанскага па праваслаўным календары) нельга глядзець на знічкі, таму што гэта прынясе няшчасце: «Дрэнная прыкмета чакае душу таго, хто ўбачыць знічку з неба — яна нясе благое».

● Лічылася, што той, хто ў гэты дзень захварэе, «будзе доўга і цяжка хварэць, і можа скананць».

● Славяне верылі ў тое, што ў момант смерці чалавека на небе згасае зорка. Часам здараецца так, што чалавек перад смерцю шмат пакутуе і каб палегчыць надыход смерці, тым, хто знаходзіцца побач з ім, неабходна было выканаць некаторыя рытуальныя дзеянні.

● Каб «выпусціць» душу, у хаце адчынялі вокны (форткі), куфэркі, у печы — юшку, засланку і г.д., расшпільвалі адзенне на паміраючым чалавеку.

● Паміраючага клалі на падлогу пад прамым вуглом да прадольных сілавых ліній памяшкання (дошкі на падлозе ў сялянскай хаце заўсёды клалі ад парога да чырвонага кута, паралельна ім ставілі ложкі, уздоўж сцяны, такім чынам чалавека неабходна было пакласці ўпоперак дошак).

● З-пад галавы прыбіралі падушку. Неабходна было прыгатаваць «спецыяльную» падушку, у якую клалі лісце з веніка ці гарохавую салому. Акрамя рытуальнай падушкі пад галаву маглі пакласці венік. Паміраючага накрывалі велікодным абрусам, а ў асобных рэгіёнах — яго вясельным адзеннем.

● З мэтай палегчыць перадсмяротныя пакуты ў рукі паміраючаму давалі грамнічную свечку (абавязкова васковую, набытую ў храме 15 лютага). Аднак, калі ў іншых выпадках грамнічнай свечкай карысталіся на працягу ўсяго года, то ў выпадку смерці чалавека яна павінна была быць спаленай у той жа дзень.

● Пра паміраючага імкнуліся нічога не казаць. Лічылася, што чым менш людзей ведае пра гэта, тым лягчэй яму будзе.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Глыбокая ноч, муж з жонкай у ложку. Жонка скрозь сон чуе:

— Каханая, давай нарэшце зойдземся сэксам.

Жонка (сонным голасам):

— Я вельмі стамілася, галава баліць...

Муж:

— Спі-спі, гэта я па тэлефоне размаўляю...

☺

Два прыяцелі:

— Гэтыя жанчыны за рулём такія нахабныя! Уяўляеш, еду, а адна ў суседняй машыне падчас руху вусны фарбуе! Я ад такога нахабства ледзь брытву ў каву не выпусціў!..

☺

— Мой дырэктар хоча мяне задушыць, — паведамляе сакратарка сваёй сяброўцы.

— Чаму ты так вырашыла?

— Варта мне спазніцца, як ён ва ўсіх пытаецца: «А дзе наша Дэздэмона?»

☺

Зручнасць — гэта калі ёсць тэлефон.

Дастатак — калі два.

Раскоша — калі тры.

Асалода — калі ні аднаго.

☺

— А вось яшчэ такі анекдоцік...

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка Травой заросшая крынічка». Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 6 (295)

Яравы часнок

Вы не паспелі высадзіць пад зіму часнок — бедаваць не варта, вы яшчэ можаце пасадзіць яравы часнок вясной. Сярод агароднікаў-аматараў ён распаўсюджаны значна менш, чым часнок азімы. Вядома, цыбуліна і зубкі ў азімага часнаку значна большыя, чым у яравога, але як паказала практыка, яравы часнок даўжэй захоўваецца. Ён паспявае ў верасні, яго закладваюць на захоўванне на зіму і ўжываюць да новага ўраджаю, у той час калі азімы ўжо ў лютым то прарастае, то зубкі робяцца мяккімі. А ўвогуле на ўчастку лепш мець дзве формы часнаку — азімы і яравы.

Часнок — холадаўстойлівая расліна. Карані здольныя кранацца ў рост пры тэмпературы каля 0 градусаў. Аднак яравы часнок менш холадаўстойлівы і больш патрабавальны да вільгаці, чым азімы. Яго садзяць вясной адразу пасля таго, як глеба растане, прычым, чым раней пасадзіце, тым большы будзе ўраджай. За два-тры тыдні да пасадкі тэмпературу захоўвання адабраных з восені здаровых буйных цыбулін зніжаюць з 18—20 да плюс 2. Непасрэдна перад пасадкай цыбуліны дзеляць на зубкі і адбіраюць найбольш буйныя з іх. Часнок добра расце на асветленых участках і не церпіць пераўвільгатнення. Глеба пад яравы часнок павінна быць ускапана і ўгноена з восені. Часнок любіць ўрадлівую глебу з нейтральнай рэакцыяй. Аднак гной пад гэту культуру ўносіць не рэкамендуецца, таму што часнок у гэтым выпадку загнівае.

На ўчастак трэба ўнесці перагной з разліку 3-4 кг на 1 кв. м, суперфасфат і хлорысты калій адпаведна з разліку 30 і 20 г на 1 кв. м. Угнаенні раўнамерна размяркоўваюць па паверхні і гэтак жа раўнамерна капаюць глебу на штык рыдлёўкі. Калі глеба ўскапаная, яе трэба старанна выраўняць. зрабіць баразёнкі на адлегласці 20 см адна ад другой, адлегласць паміж зубкамі — 5-6 см. Для паскарэння прарастання каранёў зубкі перад пасадкай можна замачыць. Каб пазбегнуць самай распаўсюджанай хваробы часнаку — ілжывай мучністай расы, зубкі перад пасадкай праграваюць на працягу 12 гадзін пры тэмпературы 40 градусаў і апрацоўваюць 1-працэнтным растворам бардоскай вадкасці. Зубкі садзяць на глыбіню 2-3 см, донцам уніз. Усходы пачынаюць з'яўляцца праз 13—15 дзён. Пры масавых усходах паверхню глебы трэба прарыхліць і даць падкормку азотным угнаеннем, для гэтага 15 г аміячнай салетры растваряюць у 10 л вады і раўнамерна паліваюць. Калі вадкасць увойдзе ў зямлю, баразёнкі закрываюць сухой глебай.

Другую падкормку азотным і калійным (хлорысты калій) угнаеннямі трэба даць у фазе ўтварэння чатырох лісцікаў. Трэцюю падкормку — калійным і фосфарным (суперфасфат) угнаеннямі рабіць у фазе сёмага ліста. Пасля кожнай падкормкі часнок паліваюць. Паліваць трэба да сярэдзіны чэрвеня. Але і пераўвільгатненя глебы часнок не выносіць.

У перыяд вегетацыі часнаку глеба павінна быць рыхлай і ўчастак не зарослы пустазеллем. У залежнасці ад гатунку яравы часнок паспявае ў канцы жніўня, верасні. Для ўборкі трэба выбраць сухое надвор'е. Затрымлівацца з уборкай нельга, бо ў дажджлівае надвор'е часнок утварае новыя карані і прарастае.

Для таго каб атрымаць добры ўраджай, запомніце некаторыя правілы:

◆ Не вяртаць часнок на ранейшае месца не раней, чым праз 4—5 гадоў.

◆ Лепшыя папярэднікі для часнаку — агуркі, кабачкі, капуста, пад якія ўносілі арганічныя ўгнаенні.

◆ Не высаджваць часнок пасля бульбы і цыбулі.

◆ Не размяшчаць побач градкі цыбулі і часнаку.

◆ Выкарыстоўваць для пасадкі цыбуліны толькі ад здаровых раслін.

Клопат пра сад

«У сярэдзіне лета на яблыках з'яўляюцца плямы, а да канца сезона большасць яблыкаў загніваюць і зноў мы застаёмся ні з чым. Чым хварэюць нашы яблыні і як можна іх выратаваць»?

Алена Іосіфаўна, *г. Мінск.*

— Цяжка меркаваць пра хваробу яблыні завочна, але па апісанні рэспандэнта дрэва пакутуе ад паршы, — кажа вядучы навуковы спецыяліст Інстытута пладаводства НАН Беларусі кандыдат сельскагаспадарчых навук Марыя МЯЛІК. — Гэта захворванне паражае лісты, чаранкі лістоў, кветкі, плады асабліва ў вільготныя цёплыя дні вясной і летам. Найбольш успрымальныя да паршы лісты ў першыя 25 дзён іх росту. Спачатку з'яўляюцца невялікія, слаба выражаныя, злёгку жаўтаватыя і як бы масляністы плямы, якія з цягам часу робяцца шэрымі з характэрным аксамітавым налётам, утвораным спорамі грыба. Гэты налёт з'яўляецца пераважна на верхнім баку ліста. Паражоныя лісты чарнеюць, засыхаюць і заўчасна

ападаюць. Плады заражаюцца ад лістоў. На іх з'яўляюцца круглыя, чорныя або шараватачорныя плямкі са светлым абадком. Гэтыя плямы пакрываюцца буравата-аліўкавым бархацістым налётам, паступова павялічваюцца ў памерах, затым іх скурка цвярдзее і растрэскваецца. Найбольш небяспечнай формай праяўлення паршы з'яўляецца ранняе паражэнне чашалісцікаў, ад якіх потым заражаюцца плады. Якія ж меры барацьбы з хваробай?

— Увосень трэба сабраць і спаліць лісце, перакапаць прыствольныя кругі, прарэдзіць загушчаную крону. У перыяд лістападу, пры наяўнасці больш як 40 працэнтаў паражоных паршой лістоў, правесці апырсканне дрэваў і апалага лісця мачавінай або аміячнай салетрай з тым, каб знізіць інфекцыйны запас хваробы. Ранняй вясной апырскаць дрэва (па пупышках, якія яшчэ не раскрыліся) 5-працэнтным растворам мачавіны, а глебу пад дрэвам — 7-працэнтным. У фазу зялёнага конусу (пачатак распускання пупышак) правесці «блакітнае апырсканне» 3—4-працэнтнай бардоскай вадкасцю або ў фазу вылучэння бутонаў — 1-працэнтнай бардоскай вадкасцю. Можна прымяняць заменнікі бардоскай вадкасці: азафос, хлорвокіс медзі, полікарбацын, поліхом. Гэтыя прэпараты (акрамя хлорвокісу медзі) у адрозненне ад бардоскай вадкасці не выклікаюць апёкаў лістоў і не прыводзяць да з'яўлення сеткі на пладах. Другое апырсканне правесці адразу пасля цвіцення. Выкарыстаць такія ж самыя прэпараты.

Як атрымаць раннія буракі?

Пры праверцы насення на ўсходжасць бывае шкада выкінуць прарослае насенне. Захавайце яго на ніжняй паліцы халадзільніка загорнутым у вільготную анучку.

У першай дэкадзе красавіка, выбраўшы невялікую дзялянку ў агародзе, там, дзе прыпякае сонейка, адкіньце снег, калі ён яшчэ ёсць, на зямлю накіньце плёнку. Праз чатыры дні перакапайце зямлю, якая растала пад плёнкай, разраўняйце яе і пасейце насенне з невялікімі белымі карэньчыкамі. З бакоў усталюйце дошкі, накрыйце іх поліэтыленавай плёнкай і старанна прысыпце з краю зямлёй.

Усходы з'явяцца хутка, і ўжо ў пачатку мая ў расліны будуць акурат тры сапраўдныя лісцікі. Крыху пазней іх трэба абавязкова рассадзіць на градку, бо высеянае насенне клубочкам дае вельмі частыя ўсходы. Расаду размясціце ў шахматным парадку да адлегласці 15 см адна ад адной. Такім чынам, ужо ў сярэдзіне чэрвеня на вашым стале з'явяцца буракі. Лепшы гатунак ранніх буракоў — Бардо. У адрозненне ад іншых гатункаў з падоўжанымі караняплодамі Бардо лёгка пераносіць перасадку. Акрамя таго, гэты гатунак не патрабуе рыхлення глебы на значную глыбіню.

Як вызначыць від угнаення

Калі агароднік-аматар не можа разлічыць від мінеральных угнаенняў, бо ў свой час не былі пазначаны этыкеткамі дзе якое, і каб не парушыць суадносіны пры ўнясенні іх пад расліны, гэта можна даведацца ў хатніх умовах пры дапамозе попелу і агню.

Угнаенні, якія ўтрымліваюць аміяк (сульфат амонію, аміячную салетру, амафос, нітраамафоску, мачавіну), распазнаць можна наступным чынам. У шкляную пасудзіну ці прабірку насыпаюць угнаенне, дадаюць попел і крыху вады, сумесь падграюць, у выніку чаго выдзяляецца аміяк, які можна лёгка вызначыць па паху (такі ж, як у тухлых яек). Аміячную салетру можна адрозніць ад сульфату амонію, калі ў пальцы ўгнаення насыпаць на гарачыя вугалькі: аміячная салетра пры гэтым успыхвае, сульфат амонію злёгку цямнее і дае белы дымок, нітраамафоска, амафос яшчэ кіпяць. Мачавіна на смак халодзіць і крыху гарчыць, пры згаранні дае рэзкі пах аміяку.

Калійныя солі на распаленых вугальках патрэскваюць, а суперфасфат выдае пах, які нагадвае пах гумы. Калійная салетра на распаленых вуглях успыхвае і згарае фіялетавым полымем. Хларыд калію — сухое ўгнаенне, крышталікі бруднаватыя, сыраватыя, якія нагадваюць неачышчаную кухонную соль.

Віды ўгнаенняў можна вызначыць і пры дапамозе воцатнай кіслаты (разбаўленая ў 10 разоў воцатная эсенцыя). Натрыевая і кальцыевая салетра ў ёй не растваруюцца, а нітрафоска, амафос і сульфат калію добра растваруюцца, але даюць моцны асадак.

Варта ведаць

У 1 сталовай лыжцы змяшчаецца: драўніннага попелу — 8 г, гашанай вапны — 9 г, мачавіны — 12 г, салетры калійнай — 18 г, сульфату амонію — 14 г, суперфасфату парашкападобнага — 17 г, фосфарнай мукі — 18 г, хлорыстага калію — 14 г;

У адным 10-літровым вядры змяшчаецца (у кг): зямлі дзярновай — 12, зямлі кампоснай або парніковай — 10, попелу драўніннага — 5, гнаевай жыжкі — 12, гною свежага каровінага — 9, перагною — 8, торфу сухога — 5.

Ружа Ісуса

Многія расліны, якія існуюць у прыродзе, авеяны шматлікімі легендамі і паданнямі. Сярод іх — марознік, расліна з сям'і люцікавых.

Паводле старажытнай легенды, гэтую расліну знайшлі ля хлява, дзе зімой нарадзіўся Ісус Хрыстос. З таго часу яе і называюць «Ружай Ісуса». У старажытнасці верылі ў лячэбную сілу марозніка і выкарыстоўвалі яго для лячэння розных хваробаў. У сучаснай медыцыне з каранёў некаторых відаў марозніка робяць прэпараты для лячэння сардэчна-сасудзістых хваробаў. Напрыклад, у Англіі па традыцыі і цяпер прынята саджаць марознікі ля дзвярэй дома. Лічыцца, што яны надзейна аберагаюць яго ад нячыстай сілы, разбураюць чарадзействы і заклінанні.

Марознікі — травяністыя шматгадовыя расліны. Прыкаранёвыя лісты ў іх буйныя, на доўгіх чаранках, звычайна вечназялёныя (у некаторых відаў на зіму адміраюць). сабраныя ў разеткі. Сустракаюцца марознікі на Каўказе, у Карпатах, Міжземнамор'і, Заходняй і Сярэдняй Еўропе і цвітуць у зімова-веснавы час, а ў сярэдняй паласе — вясной, у красавіку-маі.

У культуры часта сустракаецца садовая форма — марознік гібрыдны. Усе марознікі мароза- і засухаўстойлівыя, непатрабавальныя да глебы і даўгавечныя. На адным месцы без перасадкі яны могуць расці больш як 10 гадоў, а некаторыя віды і даўжэй. Расліны любяць заценены месцы, таму іх высаджваюць пад полагам дрэў, каля кустоў, у камяністых садах. Прыгожа выглядаюць яны ў змешаных пасадках з іншымі шматгадовымі раслінамі, якія цвітуць рана, асабліва з купенай, ясменнікам, прымуламі.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.538 Індэкс 63850. Зак. № 1191. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12